ТАМАТНЫЯ ЛІШКІ: ЗА КАПЕЙКІ І З НАКРУТКАМІ

МС

ЧАМУ ХАТНЯЕ МАЛАКО «ЗАЛАТОЕ»

МС

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

23 ЖНІЎНЯ 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 159 (29026)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

+TV ПРАГРАМА

ЛІЧБА ДНЯ

Каля 80 %

складае сярэднегадавая запаўняльнасць беларускіх здраўніц. Што немалаважна, дынамічна развіваецца экспарт паслуг. Штогод у нас праходзіць санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне больш за 200 тысяч замежных грамадзян, даходы ад рэалізацыі паслуг складаюць каля $100 млн. Пры гэтым адзначаецца рост даходаў ад экспарту згаданых паслуг летась і ў першым паўгоддзі 2019-га. У мінулым годзе выручка ад рэалізацыі паслуг замежным грамадзянам здраўніцамі краіны ў параўнанні з 2017 годам павялічылася на 13,2 % і склала Br193,3 млн. Па папярэдніх прагнозах, выручка ад экспарту паслуг здраўніцамі па выніках гэтага года складзе каля Br222 млн, а ўсяго ў Беларусі аздаровіцца больш за 220 тысяч іншаземцаў. У нашы здраўніцы прыязджаюць госці з больш чым 50 краін свету. Пры гэтым найбольшую ўдзельную вагу складаюць расіяне — 86 працэнтаў.

ЖНІВЕНЬ, ВЕЦЕР, ХВАЛІ

Як вядома, Маладзечна не азёрны і тым больш не марскі горад. Але жыхар гэтага мястэчка Яўген САКАЛОЎ не першае дзесяцігоддзе «ходзіць» пад ветразямі. Калісьці пачынаў з віндсерфінга, вучыўся і катаўся на Нарачы, Браславах, Мінскім моры, удзельнічаў у спаборніцтвах. Цяпер на ўзбраенні Яўгена іншы «карабель», які ў спрыяльнае надвор'е кліча яго на водныя прасторы. Днямі аматар кайсерфінга (катанне на кайце — вялізным паветраным змеі) Яўген Сакалоў чарговы раз наведаў Вілейскае вадасховішча, каб адчуць і ўтаймаваць стыхію вады і ветру.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

КАРОТКА

- Больш за 6,2 мільёна тон збожжа намалочана на сёння ў Беларусі.
- **Плата за карыстанне школьнымі падручнікамі ў новым навучальным годзе складзе Br12,75.**
- Удзел у ЧС па летнім біятлоне ў «Раўбічах» возьмуць атлеты з 26 краін.
- **Ядзернае паліва на БелАЭС завязуць восенню.**
- Грамадзянка Беларусі загінула ў Альпах. Цела 33-гадовай жанчыны выявілі раніцай 21 жніўня на вышыні ў 3 700 м у раёне гары Матэрхорн.

ISSN 1990 - 763X

Напярэдадні

Парты растуць разам з вучнямі

У некаторых школьнікаў і іх бацькоў яшчэ ёсць тыдзень, каб падагнаць сукенкі і штонікі пад рост, які змяніўся за лета, купіць сшыткі з алоўкамі, а вось школы Гомельшчыны ўжо прайшлі праверку на гатоўнасць да новага навучальнага года.

У аграгарадку Пакалюбічы Гомельскага раёна школа знаходзіцца на самым узгорку. Адсюль адкрываецца маляўнічы від на сядзібы, бачны шматпавярховікі новых мікрараёнаў Гомеля, які шчыльна падступае да гэтага населенага пункта. Цікава, у 1811 годзе тут была пабудавана каменная праваслаўная Нікіцкая царква. А побач з ёй у 1824 годзе размясцілася царкоўна-прыходская школа, у якой вучыліся 10 дзяцей мясцовых заможных сялян.

СТАР. 4

Школа ў аграгарадку Пакалюбічы.

Сямейныя калізіі: меркаванне спецыяліста

ПАКУЛЬ МАЦІ І БАЦЬКА ДЗЕЛЯЦЬ ДЗІЦЯ,

малому лепш пабыць у прытулку... за грошы бацькоў

«Вас трэба пакараць, не месца вам у дзяржаўных органах! Гэта з-за вас, дзяўчынак саплівых, якія нічога не ведаюць пра сямейныя адносіны, у якіх няма сваіх дзяцей, суд няправільнае рашэнне прыняў і мяне ніхто не паслухаў. Вы ж з маёй былой жонкай згаварыліся»... Так крычаў Анатоль, махаў кулакамі і стукаў па стале, патрабуючы другое заключэнне, якое, на яго думку, стане асновай для адмены рашэння суда, які пастанавіў, што чатырохгадовая Палінка павінна жыць з маці. Такія пагрозы і папрокі для спецыялістаў па апецы (папячыцельстве), якіх, дарэчы, усяго 12 чалавек на дзевяць раёнаў сталіцы, не навіна і не рэдкасць. Найбольшая колькасць зваротаў у органы апекі і камітэт па адукацыі Мінгарвыканкама датычыцца менавіта сямейных спрэчак паміж былымі сужэнцамі аб вызначэнні парадку зносін і месца жыхарства дзяцей...

СТАР. 4

АД ПАЛІТЫКІ ДА СПОРТУ

Беларусь наведала парламенцкая дэлегацыя з Польшчы

Учора польскіх калег на чале з віцэ-маршалам Сейма Рэспублікі Польшча Рышардам ЦЯРЛЕЦКІМ сустракаў у Палаце прадстаўнікоў намеснік старшыні ніжняй палаты беларускага парламента Баляслаў ПІРШТУК.

— На працягу трох апошніх гадоў у нас усталяваліся рэгулярныя і даверлівыя адносіны, чаго раней не было шмат гадоў, — адзначыў ён у размове з журналістамі. — Вельмі добры ў нас кантакт на міжнародных пляцоўках, апошнім часам поўнае разуменне ў Парламенцкай асамблеі АБСЕ, дзе мы падтрымліваем адзін аднаго, у тым ліку, па адчувальных пытаннях. Вельмі прыемна, што ў такой, досыць няпростай для нас арганізацыі, як Парламенцкая асамблея Савета Еўропы, у нас таксама ёсць падтрымка польскіх калег. Гэта сведчыць пра тое, што мы пераадолелі пэўны штучны бар'ер, які, на жаль, некаторы час быў.

Віцэ-спікер ніжняй палаты беларускага парламента заўважыў, што паміж краінамі добра развіваюцца адносіны і ў эканоміцы. Каля 400 мільёнаў еўра ўкладзена прамых польскіх інвестыцый у эканоміку Беларусі. «Гэта не проста грошы, гэта новыя тэхналогіі, новыя вытворчасці, да таго ж, у розных сферах, і перш за ўсё — інавацыйных, — сказаў Баляслаў Пірштук. — Мы тут бачым вялікі патэнцыял, хоць тавараабарот у нас немалы».

Адна з тэм беларуска-польскіх перагавораў — міжрэгіянальныя сувязі. «Нам трэба павялічыць абмен паміж нашымі грамадзянамі ў розных сферах, — лічыць намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў. — Я ўпэўнены, што спорт, культура, адукацыя, рэгіянальныя сувязі — аснова народнай дыпламатыі, якая дазволіць нарасціць і эканамічны патэнцыял».

Баляслаў Пірштук расказаў, што апроч іншага беларускія і польскія парламентарыі абмяркуюць намер аб падпісанні міжпарламенцкага пагаднення ў наступным годзе, ужо пасля парламенцкіх выбараў у абедзвюх краінах.

Спадар Цярлецкі прызнаўся, што заўсёды з задавальненнем наведвае Беларусь, і кожны раз з радасцю ўпэўніваецца ў яе развіцці. Гэтым разам акрамя перамоў з беларускім калегам аб далейшым міжпарламенцкім супрацоўніцтве, размова пойдзе пра вопыт правядзення Беларуссю Еўрапейскіх гульняў у сувязі з тым, што наступныя пройдуць у Польшчы. Польская дэлегацыя таксама возьме ўдзел у адкрыцці мемарыяльнай дошкі ў гонар Марыі Качыньскай у Нарачы, наведае могілкі з пахаванымі польскімі салдатамі і сустрэнецца з прадстаўнікамі мясцовых уладаў.

— Мы будзем казаць пра вельмі важную галіну для эканомікі і Польшчы, і Беларусі — турызм. Мы вельмі рады пашырэнню магчымасці наведваць вашу краіну без віз у памежных зонах, — сказаў віцэ-маршал.

Ён таксама дадаў, што напярэдадні падчас вячэры з беларускімі калегамі, пакуль на ўзроўні размоў за келіхам віна, прагучала ідэя правесці разам Алімпійскія гульні. «Уяўляеце, якая добрая ідэя! — падхапіў рэпліку Баляслаў Пірштук. — Гэта знімае адразу ўсе бар'еры і стварае цудоўныя ўмовы для велізарнага і дынамічнага росту!» Безумоўна, пакуль па гэта казаць рана, дадалі палітыкі, але ўсялякая справа пачынаецца з яе прагаворвання, і ўжо тое, што некаму ў галаву прыйшла такая думка — своеасаблівы знак аб праходжанні пэўнага этапу ва ўзаемаадносінах паміж краінамі.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Мовай статыстыкі

Кампанія абыдзецца краіне нашмат танней за папярэднюю

ІНТЭРНЭТ-ПЕРАПІС БУДЗЕ МАКСІМАЛЬНА ЗАШЫФРАВАНЫ

Спецыяльны сайт перапісу насельніцтва 2019 года, на якім любы ахвотны зможа самастойна запоўніць апытальнік, запрацуе з 00 гадзін 4 кастрычніка. А прома-сайт www.перапіс.бел або www.census.by запусцяць ужо 23 жніўня, паведаміла ўчора на прэс-канферэнцыі журналістам старшыня Нацыянальнага статыстычнага камітэта Іна МЯДЗВЕДЗЕВА.

Чарговы, трэці, перапіс незалежнай Беларусі пройдзе ў нашай краіне з 4 да 30 кастрычніка. Раней агучвалася інфармацыя, што ў першыя тыдні паўдзельнічаць у перапісе можна будзе дыстанцыйна — самастойна запоўніўшы перапісны ліст і адправіўшы анлайн. Такое ў нашай краіне практыкуецца ўпершыню. Прычым анлайн-перапіс будзе арганізаваны на базе дзеючай з 2016 года міжбанкаўскай сістэмы ідэнтыфікацыі.

Старшыня камітэта пацвердзіла, што гэтым разам жыхарам нашай краіны сапраўды будзе дадзена магчымасць выбраць аптымальны спосаб удзелу ў перапісе насельніцтва. Прайсці апытанне можна будзе адным з трох спосабаў — самастойна шляхам запаўнення перапісных лістоў на сябе і членаў сваёй хатняй гаспадаркі праз інтэрнэт, на стацыянарным участку альбо чакаць прыходу перапісчыка дома.

Прыняць удзел у інтэрнэт-перапісе можна з 4 да 18 кастрычніка. З 19 да 20 кастрычніка будзе праведзена ўдакладненне адрасоў, па якіх людзі яшчэ не перапісаліся, а з 21 да 30 кастрычніка да работы пачнуць далучацца перапісчыкі. Яны наведаюць толькі тых, хто да 21 кастрычніка не перапісаўся праз інтэрнэт або на стацыянарным участку.

Дарэчы, перапісацца на стацыянарным участку можна будзе на працягу ўсяго перыяду правядзення перапісу — з 4 да 30 кастрычніка.

Па выніках правядзення пробнага перапісу ў Маладзечне ў кастрычніку 2017 года і выбарачных абследаванняў хатніх гаспадарак па ўзроўні жыцця і занятасці гатоўнасць перапісацца самастойна праз інтэрнэт выказала 25 % апытаных.

Для правядзення інтэрнэт-апытання распрацавана спецыяльная інтэрнэт-праграма. Пры падрыхтоўцы інтэрнэт-перапісу Белстатам былі прааналізаваныя існуючыя ў краіне сістэмы ідэнтыфікацыі на лёгкасць і прастату аўтэнтыфікацыі карыстальнікаў і запаўнення перапіснога ліста.

Найбольш адпавядае названым патрабаванням міжбанкаўская сістэма ідэнтыфікацыі (далей — MCI), паколькі яна дазваляе забяспечыць шырокі ахоп патэнцыйных карыстальнікаў. У базе даных MCI змяшчаецца інфармацыя аб 6,8 млн грамадзян, або 71,8 % жыхароў краіны. Для ўключаных у базу даных MCI грамадзян дастаткова ўвесці ідэнтыфікацыйны нумар пашпарта і нумар тэлефона, каб атрымаць унікальны код і перайсці да запаўнення перапіснога ліста.

Акрамя таго MCI мае сістэму двухэтапнай праверкі сапраўднасці: на першым этапе — праверка ўведзенай камбінацыі (ідэнтыфікацыйны нумар пашпарта і нумар тэлефона), на другім — праверка нумара тэлефона і кода доступу, што гарантуе дадатковую абарону персанальных даных.

Той, хто перапісаўся па інтэрнэце, па заканчэнні запаўнення апытальніка атрымае сертыфікат аб гэтым. Згаданы дакумент можна спампаваць і раздрукаваць. І калі раптам да вас прыйдзе перапісчык, то можна прад'явіць сертыфікат.

Іна Мядзведзева асабліва падкрэсліла, што прыняты ўсе меры па абароне інфармацыі. Звесткі, якія перанакіроўваюцца па інтэрнэце, будуць шыфравацца і паступаць на закрыты сервер Белстата. Аператыўна-аналітычны цэнтр, кампаніі ПВТ, якія выйгралі тэндар, на першае месца таксама ставяць бяспеку і канфідэнцыяльнасць даных, атрыманых у ходзе перапісу. «Права апрацоўваць гэтую інфармацыю ёсць толькі ў некалькіх чалавек, выдзелены пакой, у які могуць увайсці толькі яны. Усе даныя перш за ўсё будуць шыфравацца — кожнаму чалавеку будзе прысвоены нумар, а прозвішча і адрас выключаны. Далей пачнецца работа па агрэгацыі даных — менавіта яны стануць асновай для прыняцця кіраўніцкіх рашэнняў», — заключыла кіраўнік Белстата.

БЫЛО 95 %, А СТАНЕ 35 %

Актыўнае прыцягненне спонсарскай і міжнароднай дапамогі для падрыхтоўкі і правядзення перапісу насельніцтва ў нашай краіне ў 2019 годзе дазволіла скараціць долю ўдзелу рэспубліканскага бюджэту.

Іна Мядзведзева падкрэсліла, што доля рэспубліканскага бюджэту на падрыхтоўку і правядзенне перапісу насельніцтва ў 2009 годзе складала 95 %, а сёлета — каля 35 %. Значную дапамогу аказаў Парк высокіх тэхналогій: каля пяці тысяч планшэтаў, якія ён выдзеліў Міністэрству адукацыі Беларусі, спачатку будуць задзейнічаны ў правядзенні перапісу, а затым перададзены па прызначэнні. Сярод спонсараў таксама значацца Беларуская калійная кампанія, МТЗ, «Галантэя», «Белфармацыя», «Еўрагандаль», арганізацыі, падпарадкаваныя Белстату. Усяго мяркуецца задзейнічаць прыкладна 12,8 тысячы планшэтаў (з улікам рэзерву). Па словах спецыялістаў, такая дапамога дазволіць скараціць час апытання рэспандэнта прыкладна ў тры разы (з 15 хвілін да 5).

Таксама Белстат атрымаў грант Сусветнага банка з агульным аб'ёмам 1,9 мільёна долараў.

Аб канкрэтных сумах атрыманай эканоміі для рэспубліканскага бюджэту Белстат пакуль не паведамляе. Але гаворка ідзе пра мільёны беларускіх рублёў. І ў тым ліку — аб зніжэнні нагрузкі на перапісчыкаў дзякуючы магчымасці запаўнення апытальнага ліста анлайн і сыходу ад папяровых носьбітаў.

Сяргей КУРКАЧ.

ПРАДУКТЫЎНЫ ДЫЯЛОГ З УЛАДАЙ

Як паказвае вопыт, суботнія тэлефонныя лініі дапамагаюць апаратыўна вырашыць праблемныя сітуацыі, якія ўзнікаюць у людзей. Упершыню такі дыялог адбыўся некалькі гадоў таму. За гэты час значна павысілася эфектыўнасць работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб.

Чарговыя прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 24 жніўня ў Мінгарвыканкаме і аблвыканкамах з 9.00 да 12.00. У гэтую суботу іх правядуць:

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Генадзь Іосіфавіч БАРЫСЮК. Тэл. 8 016 221 31 21;

старшыня ВІЦЕБСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Уладзіміравіч ЦЯРЭНЦЬЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

кіраўнік спраў ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Алена Уладзіміраўна КЛІЧКОЎСКАЯ. Тэл. 8 023 233 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО. Тэл. 8 015 273 56 44;

старшыня МАГІЛЁЎСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Дзмітрый Іванавіч ХАРЫТОНЧЫК. Тэл. 8 022 250 18 69;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Сяргей Пятровіч НЕЎМЯРЖЫЦКІ. Тэл. 8 017 500 41 60;

кіраўнік спраў МІНСКАГА гарвыканкама Ганна Мар'янаўна МАЦЕЛЬСКАЯ. Тэл. 8 017 222 44 44.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Еўрасаюзе ідэю вяртання да фармату «васьмёркі» палічылі прыкметай слабасці G7

Еўрасаюз лічыць, што запрашэнне Расіі вярнуцца да фармату «васьмёркі» ў цяперашніх умовах стала б прыкметай слабасці Групы сямі (G7). Пра гэта заявіла крыніца ў Савеце ЕС на брыфінгу напярэдадні саміту кіраўнікоў дзяржаў G7 у Біярыцы (Францыя) 24—26 жніўня.

«Ідэя запрашэння Расіі на саміт «сямёркі» без папярэдніх умоў была б контрпрадуктыўнай, гэта — прыкмета слабасці, — сказала крыніца. — ЕС пераканаты, што прычына выключэння Расіі з «васьмёркі» ў 2014 годзе захоўваецца і да сённяшняга дня».

Раней іншы еўрапейскі дыпламат растлумачыў ТАСС, што ЕС лічыць завяршэнне выканання Мінскіх пагадненняў неабходнай умовай як для адмены санкцый супраць РФ, так і для запрашэння Расіі вярнуцца ў «васьмёрку». Ён адмовіўся каментаваць той факт, што Расія з'яўляецца не проста ўдзельнікам Мінскіх пагадненняў, а гарантам іх выканання, нараўне з Германіяй і Францыяй. Еўрапейскі савет у 2015 годзе прыняў рашэнне аб немагчымасці вяртання да ранейшых адносін з Расіяй да выканання Мінскіх пагадненняў.

Японія лічыць, што без новай дамовы аб РСМД можа пачацца гонка ўзбраенняў

Міністэрства абароны Японіі лічыць, што без новага пагаднення, якое магло б замяніць Дагавор аб ліквідацыі ракет сярэдняй і меншай далёкасці (ДРСМД), можа пачацца гонка ўзбраенняў. Пра гэта заявіў кіраўнік японскага ваеннага ведамства Такэсі Івая.

«Пытанне кантролю над узбраеннямі, уключаючы ракеты, якія былі ахоплены Дагаворам (аб РСМД. — **Заўв. рэд.**), напрамую звязана з рэгіянальнай бяспекай. Неабходна адшукаць новую структуру, каб пазбегнуць новай і катастрафічнай гонкі ракетных узбраенняў», — сказаў ён.

Па словах кіраўніка мінабароны Японіі, таксама варта павялічыць празрыстасць ваенных праграм, паколькі, «акрамя ЗША і Расіі, якія былі звязаны Дагаворам, іншыя краіны таксама займаліся распрацоўкай ракет сярэдняй далёкасці».

Нагадаем, што 2 жніўня дзяржсакратар ЗША Майкл Пампеа заявіў, што Вашынгтон выходзіць з ДРСМД. Міністэрства замежных спраў Расіі таксама пацвердзіла, што дзеянне ДРСМД спынена з 2 жніўня па ініцыятыве ЗША. Прэзідэнт РФ Уладзімір Пуцін 5 жніўня даручыў назіраць за далейшымі крокамі ЗША, адзначыўшы, што ў выпадку, калі ЗША прыступяць да вытворчасці адпаведных сістэм, Расія будзе вымушана пачаць поўнафарматную распрацоўку аналагічных ракет.

Аўтамабіль Ілана Маска, адпраўлены ў космас, зрабіў першы абарот вакол Сонца



Аўтамабіль Tesla Roadster з асабістай калекцыі заснавальніка кампаніі Space X Ілана Маска з апранутым у скафандр манекенам Starman за рулём, выведзены ў космас у лютым 2018 года, здзейсніў першы абарот вакол Сонца.

Як паведаміў партал Space.com, згодна з разлікамі, поўны абарот вакол Сонца машына з манекенам за рулём здзяйсняе за 557 сутак. Яна ўжо пераадолела адлегласць у 1,2 млрд км. Пры старце ў салоне машыны гучаў запіс песні Дэвіда Боўі Life on Mars. Калі акумулятар Tesla яшчэ функцыянуе, то гэты запіс да сённяшняга дня ўжо быў паўтораны больш за 150 тысяч разоў.

Спасылаючыся на праведзеныя летась разлікі арбіты, Space.com адзначыў, што машына з манекенам за рулём зробіць яшчэ шмат абаротаў вакол Сонца, аднак у рэшце рэшт — прыкладна праз 1 мільён гадоў — увойдзе ў атмасферу альбо Венеры, альбо Зямлі і спыніць існаванне. Шанцы на тое, што яна вернецца на Зямлю, складаюць 6 %, а верагоднасць уваходу ў атмасферу Венеры ацэньваецца ў 2,5 %.

Напярэдадні падзеі

Дзеці і чэмпіёны на адной пляцоўцы

Міжнародны алімпійскі дзень пройдзе 24 жніўня ў Мінску

Ва ўсім свеце Міжнародны алімпійскі дзень адзначаецца 23 чэрвеня — у дзень стварэння сусветнай арганізацыі, але МАК рэкамендуе нацыянальным алімпійскім камітэтам самастойна выбіраць дату спартыўнага мерапрыемства ў сваёй краіне, строга не прывязваючыся да гістарычнай даты.

Начальнік аддзела па развіцці алімпійскага руху НАК Дзмітрый ДАЎГАЛЁНАК растлумачыў, чаму свята пройдзе ў Беларусі менавіта 24 жніўня. *«У чэрвені многія сілы былі задзейнічаны на Еўрапейскіх гульнях, таму мы вырашылі правесці Міжнародны алімпійскі дзень у жніўні. Дзеці вяртаюцца ў Мінск да навучальнага года, таму выбралі менавіта гэтую дату»*, — расказаў ён.

У гэты дзень каля спартыўна-аздараўленчага комплексу «Алімпійскі» размесціцца больш за 40 спартыўных пляцовак (па розных відах спорту), на іх будзе прадстаўлены не толькі спартыўны інвентар. Тут будуць працаваць трэнеры, якія зробяць набор дзяцей у спартыўныя школы. Спецыялісты дадуць кансультацыю бацькам, куды бліжэй аддаць дзіця ва ўпадабаныя секцыі.

Напрыклад, вядомая спартсменка, **старшыня Беларускай федэрацыі веласіпеднага спорту Наталля ЦЫЛІНСКАЯ,** адзначыла, што на сваёй пляцоўцы яны паспрабуюць прадставіць усе віды веласпорту. *«На адной тэрыторыі гэта, безумоўна, зрабіць складана, але мы падрыхтавалі цікавую праграму, якая спадабаецца і бацькам, і дзецям, якія вырашылі паспрабаваць сябе ў веласпорце»*.

Двухразовы алімпійскі прызёр па фрыстайлу Дзмітрый ДАШЧЫНСКІ запрасіў усіх аматараў спорту ў цэнтр «Фрыстайл», дзе ў гэты час будзе праходзіць трэніроўка, а на пляцоўцы па фрыстайле будзе ўсталяваны батут, чэмпіёны ў гэтым відзе спорту будуць адкрыты да зносін і кожны жадаючы зможа атрымаць аўтограф ад алімпійскіх чэмпіёнаў.

Чакаецца, што на свяце ўжо па традыцыі можна будзе сустрэць вядомых беларускіх спартсменаў. Падчас свята таксама пройдуць конкурсы ў фармаце «Алімпійскага квэста». Кожны жадаючы зможа паспрабаваць свае сілы ў розных відах спорту і атрымаць спецыяльную картку з 20 аддзяленнямі для пячатак ад прадстаўнікоў спартпляцовак і наглядную брашуру з картай іх размяшчэння. За паспяховае выкананне аднаго задання ўдзельнік атрымлівае адзнаку ў сваёй карце. За кожныя 10 паспяхова выкананых заданняў удзельнік атрымае школьны дзённік, а за 20 — гадзіннік з крокамерам.

Спартыўнае свята, прысвечанае Міжнароднаму алімпійскаму дню, пройдзе з 11.00 да 18.00.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Надвор'е

ЦЫКЛОНЫ АДСТУПІЛІ І ДОБРА

У нядзелю — слабы вецер, без ападкаў і тэмпература да 29 цяпла. Цудоўна!

Вось ужо сапраўды канец лета радуе нас. У выхадныя ў краіне ўсталюецца абсалютна камфортнае надвор'е, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Амаль увесь тыдзень у нас ішлі дажджы. І вось цыклоны — крыніцы дрэннага надвор'я, пакінулі нашу тэрыторыю, а на змену ім з Заходняй Еўропы зрушыўся антыцыклон, цэнтр якога заўтра ўдзень чакаецца над нашай краінай. Таму пад яго абаронай усталюецца цудоўнае надвор'е, толькі ў ранішнія гадзіны будзе даволі свежа...

Ужо сёння будзе суха, а вецер няўстойлівы і слабы. Максімальная тэмпература паветра ў разгар дня 23 жніўня дасягне 20—26 цяпла. Захавае свой уплыў антыцыклон і ў наступныя выхадныя. Застаючыся маларухомым над нашай тэрыторыяй, ён забяспечыць добрае летняе надвор'е. Будзе малавоблачна і без ападкаў. Уначы і раніцай месцамі прагназуецца слабы туман. Ноччу тэмпература паветра будзе ад плюс 8 да плюс 13 градусаў, у асобных раёнах нават пахаладае да плюс 5. Удзень паветра прагрэецца да 21—27 цяпла, у нядзелю па паўднёвым захадзе — да плюс 29 градусаў. Вецер чакаецца слабы, пераменных напрамкаў.

Па папярэдніх прагнозах айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня надвор'е пачне фарміраваць заходняя, больш цёплая частка антыцыклону. Чакаецца пераважна без ападкаў, уначы і раніцай месцамі слабы туман. Вецер пераважна ўсходні ноччу слабы, удзень умераны. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 8—14 градусаў, удзень — 23—28 цяпла. У паўднёва-заходніх раёнах краіны ў начныя гадзіны прагназуецца да 15—17 цяпла, а ў сярэдзіне дня — да плюс 30 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

Чулі?!

ЛЕЎ САПЕГА ВЯРНУЎСЯ Ў СЛОНІМ

У Слоніме ўчора ўстанавілі помнік Льву Сапегу, паведамілі ў аддзеле культуры Слонімскага райвыканкама.

Скульптура ўпрыгожыла гістарычны цэнтр. Вышыня бронзавай статуі разам з гранітным пастаментам вышэй за чатыры метры. Аўтары помніка — скульптары Іван Міско, Уладзімір Піпін і Сяргей Логвін. «Я ўраджэнец слонімскай зямлі. Можна сказаць, што зараз ажыццявілася мая мара. Ідэя ўзвесці помнік вядомаму земляку ўзнікла дзясятка паўтара гадоў таму. Рады, што яна рэалізавана», — адзначыў **Іван МІСКО.** Ён падкрэсліў: у Слоніме ўпершыню з'явіўся помнік такога маштабу.

Скульптар Іван МІСКО і старшыня Слонімскага райвыканкама Генадзь ХОМІЧ.

Фота БелТА.

Леў Сапега — значная гістарычная постаць не толькі для гэтага старажытнага горада. Распрацоўшчык Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588 года быў яго старастам, пры Льве Сапегу Слонім актыўна развіваўся. Горад стаў цэнтрам гандлю і рамёстваў. Былі пабудаваныя ратуша, гандлёвыя рады, цэхі рамеснікаў, склаўся гістарычны цэнтр з брукаванымі вуліцамі, плошчамі і мастамі. Паводле хадайніцтва Сапегі ў 1591 годзе гораду было нададзена магдэбургскае права, з'явіўся герб, на якім намаляваны леў, што трымае залатую стралу.

Урачыстае адкрыццё помніка запланавана ў Дзень беларускага пісьменства, які Слонім прыме 1 верасня.

Ва ўпраўленні культуры Гродзенскага аблвыканкама паведамілі, што ў рэгіёне з'явяцца помнікі і іншым вядомым асобам. У прыватнасці, у Жыровічах у 2020 годзе маюць намер паставіць помнік архімандрыту Серафіму Жыровіцкаму.

Паўстануць новыя помнікі і ў іншых раёнах вобласці. У Лідзе, напрыклад, увекавечылі ў бронзе вялікага князя літоўскага Гедыміна. Конная статуя вышынёй каля трох метраў з'явілася на пляцоўцы перад Лідскім замкам. Урачыстае адкрыццё скульптуры адбудзецца ў Дзень горада, які Ліда адсвяткуе 7 верасня.

Акрамя таго, у Навагрудку прапрацоўваецца пытанне аб установе помніка князю ВКЛ Міндоўгу. У Дзятлаве тым часам плануюць устанавіць скульптуру заснавальніку горада гетману Канстанціну Астрожскаму.

Рэканструкцыя, падобная да знішчэння

Легендарную сталічную гарадскую лазню № 1, якая тры гады таму закрылася на рамонт і мелася сёлета адчыніць адноўленыя дзверы, учора пачалі руйнаваць. Такой капітальнай рэканструкцыяй, якая прадугледжвае знішчэнне фасада ажно да падмурка, яна сустракае 65 гадоў свайго існавання.

За гэтыя гады будынак капрамонту не бачыў, мо таму і трываласць фундамента з перакрыццямі дайшлі да стану, які не вытрымаў бы нагрузкі, якая стварылася б падчас планаванага дагэтуль рамонту. Будынак прызналі аварыйным і пастанавілі правесці рэканструкцыю.

— Сцены вонкавага перыметра знясуць цалкам разам з другім паверхам. Дэмантуюць перакрыцці першага і другога паверхаў. Застануцца лесвічныя пралёты і ўнутраныя лесвіцы. Магчыма, нешта часткова застанецца ад першага паверха, — расказаў **Віктар РАБУШКА, намеснік дырэктара УП «Гарадскія лазні».** — Новая лазня будзе двухпавярховая, а замест гарышча, дзе раней змяшчаліся бакі з вадой і іншае абсталяванне, часткова з'явіцца трэці паверх, які стане тэхнічным.

Сцены лазні пачалі зносіць праз пару дзён, як будынак агарадзілі па перыметры. Ніякіх дэталяў са збудавання не здымалі. УКБ Савецкага раёна выступае заказчыкам аб'екта і плануе, што пасля руйнавання сцен будаўнічае смецце будзе адсартаванае. З яго выберуць метал, батарэі ды іншае, што можна ўтылізаваць як другасную сыравіну. Астатнія рэшткі паедуць на смеццік.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

Крымінал, здарэнні

БЫЛІ ЗАНАДТА ДАВЕРЛІВЫЯ...

Праваахоўнікі сталіцы затрымалі падлеткаў, якія з дапамогай мабільных тэлефонаў выкрадалі грашовыя сродкі. Як прызналіся маладыя людзі, яны думалі, што ўсачыць за перамяшчэннем грошай немагчыма, таму і прыдумалі незаконны план.

Жыхар сталіцы 17 гадоў і яго 16-гадовая сяброўка падчас канікулаў вырашылі трохі падзарабіць. Для гэтага яны прыдумалі выкрадаць сім-карты аднаго з сотавых аператараў і стварыць на іх мікра-крэдыты ў памеры 100 рублёў.

Маладыя людзі падыходзілі да прахожых і прасілі даць ім тэлефон, каб нібыта пазваніць камусьці з блізкіх. Стваральчы ілюзію размовы, малады чалавек непрыкметна даставаў сім-карту, а сотавы вяртаў грамадзяніну. Пасля гэтага ў справу ўступала яго 16-гадовая сяброўка. Яна стварала мікра-крэдыты на сім-карце, а атрыманыя грошы перавадзіла іншаму таварышу. Па такой схеме кампанія працавала каля месяца. Ад дзеянняў зламыснікаў пацярпела не менш за чатыры чалавекі. Прычынены ўрон склаў 400 рублёў.

Супрацоўнікі міліцыі заклікаюць грамадзян быць пільнымі і выконваць меры па забеспячэнні захаванасці сваёй маёмасці. Нярэдка фактарам, які спрыяе здзяйсненню большасці злачынстваў, з'яўляецца залішняя даверлівасць.

Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ.

Прыбіральшчыца абакрала дырэктара школы

Гэта адбылося ў Полацкім раёне. У мясцовы райаддзел міліцыі з заявай звярнулася дырэктар адной са школ раёна. Жанчына паведаміла праваахоўнікам, што недзе на працягу тыдня неўстаноўлены злачынец з яе незачыненага кабінета здзейсніў крадзеж грошай у суме 536 рублёў.

Супрацоўнікамі крымінальнага вышуку было ўстаноўлена, што на чужую маёмасць паквапілася адна з работніц установы адукацыі, паведамляе група інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Віцебскага аблвыканкама. Жанчына 1974 года нараджэння, працуючы прыбіральшчыцай, прыкмеціла месца, дзе захоўваліся грошы, і пасля, скарыстаўшыся неўзабаве выпадкам, здзейсніла крадзеж. Выкрадзеныя сродкі зламысніца паспела патраціць. У дачыненні да падазронай заведзена крымінальная справа.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Парты растуць разам з вучнямі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Так што гісторыю можна адлічваць і ад тых часін. Але ж двухпавярховы цагляны будынак, дзе цяпер вучацца малодшыя школьнікі, быў пабудаваны ў даваенным 1940 годзе. Праўда, праз 11 гадоў давялося цалкам яго аднавіць. Трохпавярховая прыбудова мае на фасадзе лічбу 1987. У той жа паслячарнобыльскі год ва ўстанове з'явілася і спартыўная зала.

Вучні сярэдніх класаў з венікамі і паліявічкамі бегаюць па тэрыторыі — праходзяць працоўную практыку. Дзеці радасна вітаюцца са мной і бягуць па сваіх важных справах. У фае запісваюць маё прозвішча і мэту візіту: усё па правілах. Нельга не заўважыць, што падлога блішчыць, а фарбы радуюць вока. Адразу зразумела, што тут актыўна рыхтаваліся да новага навучальнага года. Дарэчы, характэрнага паслярамонтнага паху практычна няма. Усё было зроблена загадзя. Далей па класных аўдыторыях, дзе пакуль няма навучэнцаў, мяне суправаджае **дырэктар Валянціна ХАМЯКОВА.**

— Што датычыцца рамонту, мы заўсёды загадзя плануем, якія кабінеты будзем аднаўляць, — кажа Валянціна Іванаўна. — Сёлета цалкам аднавілі кабінет хіміі. У ім паставілі новую мэблю — нашы нямецкія калегі і сябры аказалі гуманітарную дапамогу. Хацелі б сюды і новае абсталяванне, але пакуль будзем карыстацца тым, што ёсць у наяўнасці.

— Хімія ў нашых вучняў запатрабавана, — дадае **выкладчык Алена ЛУПІКАВА.** — Многія нашы выпускнікі імкнуцца паступаць у медыцынскія ўстановы Беларусі. У тым ліку ў Гомельскі медыцынскі.

У аўдыторыі, дзе праходзяць урокі гісторыі, зроблены сучасныя стэнды на беларускай мове: княствы Полацкае, Тураўскае, Вялікае Літоўскае, Рэч Паспалітая, усе гістарычныя перыяды ў выявах і датах... Тэматычныя стэнды дапамагаюць лепш успрымаць і засвойваць інфармацыю. Вельмі зручная мэбля і камп'ютар у дапамогу.

У 2013 годзе па праграме Міністэрства адукацыі ў Пакалюбіцкай школе з'явіўся сучасны кабінет фізікі. І праз шэсць гадоў ён адпавядае сучасным патрабаванням. Інфарматыка, зразумела, таксама ў прыярытэтах. Дырэктар з гонарам дэманструе кабінет, дзе ўсталяваны інтэрактыўная дошка, сучасныя камп'ютары з магчымасцю выхаду ў інтэрнэт і праектар пад столлю:

— Мы імкнёмся, каб кабінет інфарматыкі быў запоўнены штодзень. Таму тут праходзяць розныя заняткі, якія патрабуюць выкарыстоўвання наяўнага сучаснага абсталявання. Сёлета аднавілі калідоры і фае школы, спартыўную і актавую залу таксама. У памяшканнях харчблоку таксама зрабілі рамонт. Так што школа наша практычна як гарадская.

Юная жыхарка аграгарадка Пакалюбічы Ліза ХАМЯКОВА прыйшла ў школу з мамай Людмілай, якая тут працуе настаўніцай. Парты ў класе, дзе будзе вучыцца другакласніца, «растуць» разам з вучнямі. Штогод іх крыху падымаюць у залежнасці ад таго, як вырас школьнік.

— Такім чынам, — паказвае кіраўнік вучэбнай установы, — да завяршэння чацвёртага класа парты паступова «дарастаюць» да апошняй, зялёнай адзнакі. А пакуль тут устаноўлена фіялетавая.

Школьнікі праводзяць ва ўстанове столькі часу, што клопат пра зручнасць мэблі, пра асвятленне неабходны. Дарэчы, ёсць шмат іншых умоў, на якія звяртаюць увагу педагогі. Напрыклад, і для вучняў, і для іх бацькоў зручна, што Пакалюбіцкая сярэдняя школа працуе толькі ў адну змену. Між тым сёлета за парты тут сядзе 320 школьнікаў. Але ж, кажа дырэктар, у 2020/2021 навучальным годзе вучняў стане больш і давядзецца ўсё ж уводзіць другую змену.

І гэта зразумела, бо ў прэстыжных прыгарадных Пакалюбічах пастаянна ідзе будаўніцтва. Не толькі прыватных дамоў: нядаўна быў пабудаваны шматпавярховік. Значыць, колькасць юных жыхароў таксама павялічыцца. Дарэчы, тая ж тэндэнцыя назіраецца ва ўсім раёне.

Як расказала **начальнік аддзела адукацыі, спорту і турызму Гомельскага райвыканкама Алена КАВАЛЁВА,** 6 380 школьнікаў у гэтым раёне цяпер рыхтуюцца сесці за парты. 770 з іх пойдуць у першы клас. За кошт унутранай міграцыі і будаўніцтва ў прыгарадзе адбываецца паступовае павелічэнне колькасці дзяцей у вучэбных і выхаваўчых установах.

Сёлета ў дашкольныя ўстановы раёна прыйдзе 2 700 малых, што на сотню больш, чым летась. Арганізаваны падвоз дзяцей у вучэбныя ўстановы. Школьнымі аўтобусамі штодзень будуць карыстацца каля 900 вучняў Гомельскага раёна.

Ірына АСТАШКЕВІЧ, фота аўтара.

ПАКУЛЬ МАЦІ І БАЦЬКА ДЗЕЛЯЦЬ ДЗІЦЯ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Незадаволеныя бацькі, як правіла, скардзяцца, што спецыялісты органаў апекі перадалі ў суд няправільнае заключэнне, таму выйшла не так, як яны жадалі. Або патрабуюць, каб судовую пастанову выконвала не служба органаў прымусовага вядзення, а спецыялісты апекі.

— Функцыі па апецы і папячыцельстве ў дачыненні да непаўналетніх ускладзены на ўпраўленні па адукацыі. І ва ўсіх раёнах сталіцы сапраўды працуе моладзь. Нягледзячы на тое, што іх мала, яны спраўляюцца. Тым больш што гэта адукаваныя, кампетэнтныя спецыялісты, якія мусяць кантраляваць свае паводзіны, паколькі яны дзяржслужачыя. Пры гэтым яны вымушаны выслухоўваць усе прэтэнзіі грамадзян, — каментуе **Зінаіда ВАРАБ'ЁВА, загадчык сектара сацыяльна-педагагічнай работы і аховы дзяцінства камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама.** — Усе сітуацыі, спрэчкі, канфлікты пры абароне інтарэсаў дзяцей разглядаюцца з прыцягненнем сацыяльна-педагагічных і псіхалагічных службаў, устаноў адукацыі, спецыялістаў раённых сацыяльна-педагагічных цэнтраў (СПЦ) і цэнтраў карэкцыйна-развівальнага навучання і рэабілітацыі. Аднак праблема ў тым, што, як паказвае практыка нашага ўдзелу ў судовых пасяджэннях па сямейных спрэчках, часта свабоды і інтарэсы дзяцей парушаюцца іх уласнымі бацькамі, якія злоўжываюць сваімі правамі на малых.

Сапраўды, часам даходзіць нават да таго, што адзін з бацькоў выкрадае дзіця ў другога — з якім малому прызначана жыць па судзе — і ўтойвае яго ад сваякоў, хаваецца, мяняе месца жыхарства. Такімі неправамернымі паводзінамі выкрадальнік парушае правы добрасумленнага бацькі, таму што адсутнічае эфектыўны механізм абароны законнага прадстаўніка дзіцяці.

— Адміністрацыйная працэдура, якая прадугледжвала б устанаўленне органам апекі і папячыцельства парадку ўдзелу ў выхаванні дзіцяці таго з бацькоў, які жыве асобна ад малога, у заканадаўстве краіны адсутнічае. Палажэннем аб органах апекі і папячыцельства на органы ўпраўлення адукацыяй абавязак вызначаць парадак удзелу ў выхаванні дзяцей асобна пражываючых ад іх бацькоў таксама не ўскладзены. Усе спрэчкі, што датычацца гэтага пытання, вырашаюцца судамі, а орган апекі і папячыцельства пры разглядзе такіх пытанняў прыцягваецца да ўдзелу ў справе згодна з артыкулам 86 Кодэкса аб шлюбе і сям'і, — сцвярджае спецыяліст. — Пры гэтым судовы разбор прызначаецца пасля атрымання ад органаў апекі і папячыцельства заключэння па сутнасці разглядаемай спрэчкі разам з дакументамі, дзе адлюстраваны выяўленыя абследаваннем фактычныя абставіны справы. Аднак заключэнне — гэта толькі адзін з доказаў, якія ацэньваюцца судом нароўні з іншымі. Яно не мае для суда загадзя ўстаноўленай сілы. Суд можа не пагадзіцца з вывадамі заключэння і вынесці іншае рашэнне, якое ён абавязаны матываваць. Калі ж абследаванне было недастаткова кампетэнтнае або кваліфікаванае, а вывады супярэчаць абставінам справы, або калі неабходна праверыць аб'ектыўнасць пазіцыі асобы, якая праводзіла абследаванне, суд мае права прызначыць паўторнае абследаванне.

З іншага боку, цяжкасць выканання рашэння суда па справах, звязаных з вызначэннем месца жыхарства дзіцяці і ўстанаўленнем парадку ажыццяўлення бацькоўскіх правоў, спрыяе безадказным і беспакараным паводзінам таго з бацькоў, хто не выконвае судовае рашэнне. Пры гэтым чым больш малое не бачыцца з адным з бацькоў, тым больш на яго ўплывае той, хто жыве з ім. Спрэчкі па выхаванні дзяцей працяглыя. І звычайна іх выйграе той, хто менш думае пра дзіця, для каго не важна, як іх дачка ці сын у далейшым пабудуюць узаемаадносіны ва ўласных сем'ях, хто не зважае на тое, што малыя выхоўваюцца ў непрыязнасці, а то і ў непрыманні ўласнай маці ці бацькі, мяркуе Зінаіда Вараб'ёва.

З кожным годам гэтая праблема, на жаль, толькі абвастраецца, што, у сваю чаргу, супярэчыць інтарэсам дзіцяці, якое ў выніку разлукі бацькоў знаходзіцца ў стрэсе. Пры гэтым заканадаўствам устаноўлены межы ажыццяўлення бацькоўскіх правоў, пры парушэнні якіх павінны ўключацца механізмы абароны і малога, і пацярпелага з бацькоў з прыцягненнем вінаватага боку да адказнасці. Аднак пакаранне за невыкананне рашэння суда ў выглядзе штрафу — гэта несур'ёзна. Яно толькі падкрэслівае, што законам прадугледжаны яўна недастатковыя меры ўздзеяння на таго з бацькоў, хто перашкаджае выхоўваць дзіця і клапаціцца пра яго другому, калі той жыве асобна ад малога, сцвярджае прадстаўніца Мінгарвыканкама.

— Нядаўна ў нас узнікла сітуацыя, калі прымусовае выкананне рашэння, звязанага з адабраннем дзіцяці і перадачай яго іншай асобе, запатрабавала змяшчэння падлетка ў прытулак СПЦ, дзе з ім займаюцца кваліфікаваныя спецыялісты ў галіне дзіцячай псіхалогіі. Аднак выпадкі такога ўладкавання дзяцей, уцягнутых у сямейны канфлікт, адзінкавыя, — гаворыць спецыяліст. — Думаю, што калі б дзеці знаходзіліся ў адным з прытулкаў, пакуль іх бацькі намагаюцца вырашыць свае праблемы, даслыя змаглі б пераасэнсаваць сітуацыю і зрабіць нешта для яе ўрэгулявання перш за ўсё ў інтарэсах сваіх малых. Лічу, што ў сітуацыях сямейных канфліктаў, калі бакі не могуць дамовіцца, трэба абавязкова, па заяве аднаго з бацькоў, змяшчаць дзяцей у прытулак СПЦ за грошы, якія павінны выплачваць за іх утрыманне ва ўстанове і бацька, і маці.

Ірына СІДАРОК.

Класныя навіны

ЛЕТА + ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ

У Брэсцкай вобласці завяршыўся праект «IT-лагер». Сёлета інтэнсіў па сучасных тэхналогіях быў арганізаваны амаль для сотні выхаванцаў дзіцячых дамоў, а таксама дзяцей з сем'яў, якія пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС. Школьнікі вучыліся праграмаваць, ствараць сайты і канструяваць робатаў.

IT-лагер МТС праходзіў на базе дзіцячага рэабілітацыйна-аздараўленчага цэнтра «Колас» і дзіцячых аздараўленчых летнікаў «Арляня» і «Салют» у Брэсцкай вобласці. Урокі праводзілі выкладчыкі Школы інфармацыйных тэхналогій па шасці тэматычных кірунках: «Робататэхніка», «Стварэнне сайта», «3D-мадэляванне», «Праграмаванне ў Scratch і Kodu», «Графічны дызайн» і «Дызайн інтэрфейсаў». Вучэбная праграма была распрацавана для школьнікаў ва ўзросце ад 6 да 17 гадоў. Дзеці вывучалі асновы праграмавання, малявалі аб'ёмныя 3D-мадэлі, вучыліся самастойна ствараць робатаў.

У рамках праекта таксама прайшоў адкрыты ўрок, які правёў робат. Больш за 250 дзяцей даведаліся пра асноўныя прынцыпы робататэхнікі. Акрамя таго, кіберпедагог расказаў, з якіх элементаў складаецца прылада са штучным інтэлектам, дзе сёння выкарыстоўваюцца робаты і якія прафесіі будуць запатрабаваныя ў будучыні.

«IT-лагер» — сумесны праект кампаніі МТС і Міністэрства адукацыі. Сёлета ён быў рэалізаваны ўжо трэці раз.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЧЫЙ БОРШЧ НАЙЛЕПШЫ?

...У адной папулярнай дзіцячай песеньцы сцвярджаецца, што дружба пачынаецца з усмешкі. Я спрачацца не буду: з яе, відаць, таксама, але ж не толькі.

Больш за 20 гадоў таму я прыйшла працаваць на Мінскі трактарны завод, атрымала так званае «ложка-месца» ў інтэрнаце і, відаць, да скону не забудуся, як упершыню адчыніла дзверы ў свой пакой, убачыла там дзяўчыну і пачула:

— Есці будзеш?.. Тады мый рукі.

Лёгкім кіўком галавы мне паказалі, дзе гэта можна зрабіць, падалі ручнік. Я села за стол і адчула сябе... як дома.

Вось так, з сумеснага перакусу (імя ў мяне спыталі пазней), пачалося маё новае дарослае жыццё, а галоўнае — шчырае сяброўства з Ірай. Што і нядзіўна: мы жылі ў адным пакоі, працавалі на адным прадпрыемстве, разам сталаваліся, адпачывалі. Яна не раз гасцявала ў маіх бацькоў, я — у яе...

А потым здарылася тое, што і павінна было: Іра выйшла замуж — за вайсковца, паматалася з ім па Расіі, там жа, непадалёк ад Піцера, асела на ПМЖ... Аднак увесь гэты час мы з ёй слова сваё трымалі: як мінімум раз на год на тыдзень-другі сустракаліся. Гэта значыць, альбо яна прыязджала да мяне, або я да яе, альбо мы ўдзвюх выпраўляліся некуды ў санаторый ці дом адпачынку.

У той раз сяброўка (не падабаецца мне слова «подруга»... Нешта ёсць у ім часовае: падружыў-падружыўды кінуў...) разам з сям'ёй была ў Беларусі. Яе малодшы сын пацягнуў нас на так званую Лінію Сталіна. Па дарозе туды грэх было не заехаць у Заслаўе, не заказаць там абед. Справа ў тым, што Ірын муж досыць даўно «пасадзіў» страўнік. А яшчэ даўней нажыў праблему з лішнімі кілаграмамі. Таму з раніцы (і для жонкі гэта закон) яму патрэбна свежая каша, а ў абед — добрая талерка гарачага супу.

Такім чынам, з'есці яго (і вядома ж, не толькі) мы планавалі на зваротным шляху, у Заслаўі. Помню, што добра прыпазніліся, прагаладаліся, пад'ехалі да кафэ і...

Апомніцца не паспелі, як на нас наляцела нейкая жанчына. «Маша? Не Маша?» — пераглянуліся мы з Ірай.

Аказалася, што гэта яна, уласнай персонай — таксама завадчанка, пяюха, танцорка, суседка па інтэрнаце, якая цяпер жыве непадалёк, у прыватным доме.

— Гэта з кіламетр адсюль. Едзем да мяне! — досыць настойліва запрашала прыяцелька.

— Але ж абед, — нясмела запярэчыла Іра, — майму Алегу першая страва трэба.

— Дык будзе! Гэта лёгка, — тут жа паабяцала Маша. — Я баршчок для яго звару.

— Гэта ж доўга, — дружна заявілі мы.

— Ды дзесяць хвілін, не болей. Едзем?!

— ?!

(Хоць бы дзеля гэтага — ну згадзіцеся — з'ездзіць нам трэба было).

Як аказалася, сакрэт Машынай фірменнай стравы заключаўся ў загадзя звараным бураку.

А сам працэс і сапраўды заняў лічаныя хвіліны. З маразілкі гаспадыня дастала невялікую ёмістасць з замарожаным булёнам (звараным, дарэчы, на курыцы з сушанымі баравікамі), закіпяціла яго, апусціла ў каструлю натаркаваны бурак. Зноў закіпяціла. Далей — соль, прыправы, смятана і...

— Смачна есці!

Трэба сказаць, што рабіць гэта Ірын муж не збіраўся. Пакаштаваць? Магчыма. Пахваліць? Абавязкова, але не больш.

Мы бачылі як ён — з асцярогаю — узяў лыжку, пасмакаваў, вытрымаў паўзу і... папрасіў хлеба, пасля чаго ўжо і мы дружна замахалі лыжкамі. Голад і сапраўды найлепшая прыправа.

Пакуль уміналіМашын баршчок (гаспадыня, яе маці і бабуля так называлі гэтую страву), на стале з'яўлялася нешта яшчэ. Мы таксама не з пустымі рукамі прыехалі... Карацей — пад'елі на славу, пабачыліся, пагаварылі, пагулялі па горадзе.

...Але ж галоўнае зусім не гэта: з таго нечаканага абеду прайшло амаль восем месяцаў, за якія Ірын муж, досыць часта і ўласнаручна варачы Машын баршчок, «скінуў» амаль 10 кілаграмаў, якія, што важна, назад не вярнуліся.

Вось і думайце пасля гэтага, чый баршч найлепшы.

А. Тарасава, *г. Мінск.*

НАВОШТА ГАРОД ГАРАДЗІЦЬ

Скажу адразу: усе ўдзельнікі і героі гэтай гісторыі (недзе смешнай, а недзе і драматычнай), дзякуй богу, жывыя-здаровыя, аднак імёны я ўсё-ткі змяніў.

Значыць, была вясна, прыгожы сонечны ранак, спакой — і на вуліцах мястэчка, і ў памяшканнях сельсавета, — як раптам дзверы ў кабінет старшыні адчыніліся, і на парозе з'явілася эфектная бландзінка з высокай моднай прычоскай, яркім макіяжам і воблакам дарагіх духоў. Абцяжарваць сябе нейкім «уступным словам» у выглядзе прывітанняў ды знаёмства яна не стала.

— Так, — стукнула рукой па стале, — я забараняю пасвіць кароў ля сцен майго дома.

— Дык вы што — з мясцовых? — спытаў старшыня.

— З мясцовых... Участак купілі на сваю галаву, і цяпер ад вашага статку ўсе мухі ў нашым двары. Ні табе паесці, ні пазагараць...

— Але ж статак нельга не пасвіць, — паспрабаваў быў заікнуца Пятровіч. — Бо карова — гэта ўсё ж для вяскоўца...

— Дык няхай той вясковец «гэта вашае ўсё» і пасе — ля свайго дома, а не ля майго. Зразумелі? Два дні вам даю, — з выклікам сказала дама, досыць рэзка павярнулася да дзвярэй і выйшла, вынесшы з сабою пах дарагой парфумы.

У кабінеце старшыні стала ціха і сумна.

— Падумаеш, краля! Прыехала аднекуль ды будзе вучыць, як жыць нам на нашай зямлі, — абурыўся Пятровіч.

— Ага... Ёй, ці бачыце, каровы перашкаджаюць, — падтрымала старшыню сакратарка. — А малачко ды смятанка з тваражком, мусіць, не? Відаць, любіць паесці?

На гэтым размова скончылася і, можна сказаць, забылася: статак кароў пасвіўся там, дзе пасвіўся. Як раптам ліст «зверху»: маўляў, паступіла скарга ад грамадзянкі Ю. М. наконт выпасу кароў пад вокнамі дома. Дык вы там разбярыцеся...

Лёгка сказаць, а вось як зрабіць?

...Не паспеў старшыня хоць нешта прыдумаць, як прыйшоў яшчэ адзін ліст — ужо з Мінска і з катэгарычным: «Тэрмінова прыняць меры...»

Пакуль у сельсавеце ламалі галовы над ранейшым пытаннем, якія (канкрэтна) заяўніца, згледзеўшы статак на подступах да ўласнага дома, выйшла насустрач каровам, прытым не адна, а з аўчаркай, і дала ёй каманду «фас»...

Пастухі Пеця і Коля таксама не разгубіліся. На службе ў іх была прыгажуня лайка, і яны сказалі: «Узяць!»

Што тут пачалося!..

Калі сабак разнялі, счапіліся гаспадары: тая самая бландзінка і пастухі, аднаго з якіх аўчарка ўкусіла за пятку, парваўшы кед...

У выніку назаўтра толькі і гутаркі было, што «панаехалі», маўляў, «розныя»... І цяпер са сваім статутам у чужы манастыр... Ды бачылі мы такіх!..

З гэтымі словамі ў славесныя баталіі ўключылася мясцовая эліта — настаўнікі, інжынеры, леснікі... У іх таксама былі каровы, яны ведалі свае правы і тое, куды пішуцца скаргі.

...Такім чынам і ў хуткім часе ў мястэчка прыехала высокае начальства, пабывала на месцах «баёў», выслухала галоўных герояў.

— Зазірніце ў інтэрнэт, — давадзіла абураная заяўніца, — у Амерыцы каля жылых дамоў пашы наогул няма. Хто парушыць гэтае правіла, заплаціць вялікі штраф. У Германіі вывозіць гной дазваляецца строга ва ўстаноўленыя гадзіны. А ў нас, атрымліваецца, каровы пад вокнамі ходзяць? І што мы?

Мы, як аказалася, таксама не лыкам шытыя. Высокае начальства прыняло рашэнне: за сто метраў ад дома заяўніцы паставіць... 800 метраў агароджы.

— І гэта зараз, у час жніва?! — паспрабаваў абурацца Пятровіч. — Калі тут ні свабодных машын, ні людзей, ні грошай?!

Але ж нічога не было — і ўсё... знайшлося: на піларараме дамовіліся пра жэрдкі і слупкі, а каб паставіць іх ды ўсё папрыбіваць, «трымальнікі» кароў выйшлі на суботнік.

...Здаецца, што толькі ўчора гэта было, а як жа ўсё змянілася! З вялікага статку (на 200 галоў!) у мястэчку засталіся толькі тры кароўкі. Можна, як высвятляецца, жыць без іх: прычым лёгка, усё прадаецца ў крамах.

Так што агароджа тая больш не патрэбная.

Б. В., *Брэсцкі раён.*

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Неасабісты суб'ектыў

ПЕРЫЯД ПАЎРАСПАДУ

Экалагічна свядомае пакаленне толькі падрастае. Што будзе рабіцца на нашай зямлі, пакуль яно вырасце?

На мінулыя выхадныя разбіралі старую паветку, якая за зіму пахілілася і лягла на зямлю. Не хочаш, але мусіш — давялося разбіраць, выцягваючы на свет божы ўсякую трасцу: перапрэлую салому, бітую цэглу, ржавае жалеза, шкляныя бутэлькі ад поснага масла (памятаеце, здавалі іх рэдка, бо было не дамыцца), рыззё, што калісьці было адзежай, кавалкі цэлафану — яго было асабліва шмат, пэўна, калісьці склалі ў паветку рэшткі вялікага парніка. І што характэрна — праляжаўшы гадоў дваццаць у вільготным асяроддзі, ён зусім не папсаваўся. «Які ж у яго тады перыяд распаду?» — з цікавасцю пыталіся адно ў аднаго, выцягваючы з-пад друзу чаговы брудны, але зусім не пашкоджаны кавалак.

ВАДАЛІЎ. З'явіцца магчымасць вырашыць некаторыя праблемы, якія вы доўга гналі ад сябе. Паспрабуйце спакойна асэнсаваць сітуацыю, і тады магчымы паспяховы прарыў да мэты. У аўторак пажадана праяўляць асцярожнасць як у словах, так і ва ўчынках. Захоўвайце нейтралітэт, нават калі вакол вас кіпець спрэчкі і жарсці.

РЫБЫ. Прыйшоў час радавацца жыццю і ўмела выкарыстоўваць магчымасці. Тыдзень спрыяльны для кардынальных змен. Пачаць можна са свайго іміджу, працягнуць — стылем зносін і работай. Усё пераменіцца выключна да лепшага. Аўторак — удалы дзень для пачатку падарожжаў. У чацвер на рабоце не выключаны невялікі канфлікт, але ён хутка вырашыцца. Выхадныя дні — добры час для зносін з раднёй і дзецьмі.

Даты Падзеі Людзі

23 ЖНІЎНЯ

У краіне

1924 год — нарадзіўся (вёска Азершчына Рэчыцкага раёна) Георгій Паўлавіч Лапато, беларускі вучоны ў галіне вылічальнай тэхнікі і інфарматыкі, член-карэспандэнт НАН Беларусі, АН СССР, Расійскай АН. У 1969—1987 гадах дырэктар НДІ ЭВМ. Аўтар больш чым 120 навуковых прац і 46 вынаходак. Асноўныя работы ў галіне распрацоўкі і ўкаранення ў прамысловасць ЭВМ сямейства «Мінск», ЭВМ Адзінай сістэмы і персанальных камп'ютараў на базе мікраэлектронікі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1970) за стварэнне сямейства ўніверсальных электронных вылічальных машын другога пакалення тыпу «Мінск» і асваенне іх серыйнай вытворчасці. Памёр у 2003 годзе.

У свеце

1880 год — нарадзіўся Аляксандр Сцяпанавіч Грын (Грынеўскі), рускі пісьменнік. Сын выхадца з Беларусі, сасланага ў Сібір за ўдзел у паўстанні 1863—1964 гадоў. Грын шмат падарожнічаў па краіне, быў у ссылцы. Першае апавяданне «Заслуга радавога Панцялеева» было канфіскавана і знішчана. Усяго напісаў больш за 350 апавяданняў, аповесцяў, вершаў, паэм, сатырычных мініяцюр. А. Грын стварыў уласны, непаўторны свет, абвеяны рамантыкай прыгод. Да найбольш папулярных належаць раманы «Дарога нікуды», «Зэяючы свет», аповесці «Тая, што бяжыць па хвалях» і «Пунсовыя ветразі». Яго творчасць доўгі час замоўчвалася ў Савецкім Саюзе і была прызнана толькі ў 1960-я. Памёр у 1932 годзе.

1939 год — у Маскве старшынёй СНК і наркамам замежных спраў СССР В. Молатавым і міністрам замежных спраў Германіі І. Рыбентропам быў падпісаны «Дагавор аб ненападзе паміж Германіяй і СССР» («Пакт Молатава — Рыбентропа») тэрмінам на 10 гадоў. Дагавор прадугледжваў узаемныя абавязацельствы дзвюх дзяржаў устрымлівацца ад прымянення сілы і агрэсіўных дзеянняў як асобна, так і сумесна з іншымі дзяржавамі. Заключаныя пагадненні і сакрэтныя пратаколы да яго зрабілі сур'ёзны ўплыў на Беларусь, тэрыторыя якой стала напярэдадні і ў пачатку Другой сусветнай вайны аб'ектам актыўнай дыпламатычнай і ваенна-палітычнай дзейнасці з боку СССР і Германіі. У адпаведнасці з «Дадатковым сакрэтным пратаколам» да дагавора прадугледжвалася размежаванне сфер уплыву СССР і Германіі ва Усходняй Еўропе. Бакі прыйшлі да пагаднення аб падзеле Польшчы і размежаванні сфер інтарэсаў на яе тэрыторыі па лініі рэк Нараў, Вісла і Сан, што азначала пераход у сферу інтарэсаў СССР Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Масква і Берлін прызналі інтарэсы Літвы на тэрыторыі Віленшчыны.

1943 год — завяршылася бітва на Курскай дузе, адна з найбуйнейшых бітваў у гісторыі сусветных войнаў, у якую з абодвух бакоў было ўцягнута больш за чатыры мільёны чалавек, звыш 69 тысяч гармат і мінамётаў, каля 13 тысяч танкаў і самаходных артылерыйскіх установак і да 12 тысяч баявых самалётаў. Перамога пад Курскам азначала пералом у ходзе Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў. Фашысцкія войскі пацярпелі поўнае паражэнне, што прадвызначыла вынік вайны.

1944 год — у Румыніі адбылося нацыянальнае антыфашысцкае паўстанне. Кароль Міхай аддаў загад аб арышце маршала Антанеску і абвясціў аб выхадзе краіны з вайны на баку гітлераўскай Германіі. Ужо 24 жніўня новы ўрад абвясціў вайну Германіі.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.01	20.22	14.21
Віцебск —	5.47	20.15	14.28
Магілёў —	5.51	20.12	14.21
Гомель —	5.52	20.05	14.13
Гродна —	6.17	20.37	14.20
Брэст —	6.21	20.33	14.12

Месяц

Апошняя квадра ў 17.55. Месяц у сузор'і Блізнят.

Імяніны

Пр. *Вячаслава, Лаўрэнція, Рамана.*
К. *Валерыі, Ружы, Апалінара, Валяр'яна, Віктара.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Дзеці — кветкі жыцця :)

Маладая мама перад люстэркам прымярае новае футра, падыходзіць маленькая дачка і кажа:

— Матуля, якая ты прыгожая ў гэтым футры!

— Праўда?

— Так, праўда, ты ў ёй на аўчарку падобная!

Маю першую дзяўчыну звалі Ала, але мы з ёй расталіся. Па іроніі лёсу другую таксама звалі Ала, і мы таксама з ёй расталіся. Але зараз сябры мяне называюць Алкатэстарам!

— А калі ўсе скасочаць з даху, ты таксама скасочыш?

— Ну, табе ж нічога не перашкаджае гаварыць гэтую фразу, якую таксама ўсе гавораць.

Не ведаю, як вы, а я, калі ем, самае смачнае пакідаю напрыканцы. Напрыклад, калі мая дзяўчына прыгатавала мне салацік з рукалы і сельдэрэю, я пачну са скандалу і скончу стэйкам і віскі ў стрыпбары.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ тэл./факс: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2797.

Нумар падпісаны ў 19.30 22 жніўня 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
23 жніўня 2019 г. № 34 (519)
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ТЭМА ТЫДНЯ

Фота Анатоля КЛЕЩЧУКА.

ЗАПАС БЯДЫ НЕ ЧЫНІЦЬ

Акрамя багатага ўраджаю традыцыйнай агародніны, у краіне сёлета мяркуюць сабраць каля 450 тон бахчавых культур

КОЖНЫ гаспадар ведае: дома павінна быць тое-сёе з прыпасаў. Ну хоць бы для таго, каб хлебасольна павітаць нечаканых гасцей. Ды і ўвогуле, неяк спакайней, калі ведаеш, што лыжка мукі — не апошняя ў хаце... Такі ж парадак дзейнічае і на дзяржаўнай «кухні»: збожжа павінна хапіць да наступнага ўраджаю, яшчэ і з запасам. Ды не толькі надзённага хлеба, а і прысмакаў трэба нарыхтаваць. Колькі прадукцыі захоўваецца ў засеках і як можна зарабіць на малацэ, нам расказалі супрацоўнікі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі. стар. 3

«ЗЯЛЁНАЯ» ЭКАНОМІКА

РЭАЛЬНЫЯ КРОКІ ДАЮЦЦА НЕ ПРОСТА,

або Малыя гарады на шляху да ўстойлівага развіцця

На пачатку чэрвеня ў Навагрудку адбыўся XV Рэспубліканскі экалагічны форум, на якім разглядаліся пытанні развіцця «зялёнай» эканомікі, ці, іншымі словамі кажучы, «зялёнага» росту. Навагрудак з 2017 года якраз з'яўляецца пілотным горадам праекта «Зялёныя гарады».

Як вядома, стратэгія ўстойлівага развіцця праз падтрымку «зялёнай» эканомікі ўзнікла не сёння. Яна бярэ свой пачатак з Канферэнцыі «Рыа+20» (2012 г.), на якой краіны свету, і Беларусь у тым ліку, пагадзіліся стаць на шлях «зялёнай» эканомікі — як найважнейшага інструмента гэтай стратэгіі. Перакананы, што асноўная работа ў нас яшчэ наперадзе. Сёння мы можам з задавальненнем канстатаваць, што розныя дзяржаўныя і рэгіянальныя праграмы, уся адукацыйная сфера ў той ці іншай ступені ўтрымліваюць экалагічны складнік. Аднак патрабаваннем дня з'яўляюцца не тэарэтычныя палажэнні, а рэальныя крокі на гэтым шляху.

Мне, грамадзяніну Беларусі і жыхару гарадскога пасёлка, цікава назіраць, як на практыцы рэалізуюцца крокі па «азяляненні» эканомікі, і меркаваць, што было б разумна ў гэтых адносінах змяніць.

Пачаць свае разважанні хочацца з выбару прыярытэтаў для «зялёнага» развіцця. Зразумела, што такім колерам павінна «афарбавацца» ўся нацыянальная эканоміка і ўсе рэгіёны краіны. Аднак магчымасці Беларусі, нават пры дапамозе міжнародных арганізацый, якія фінансуюць шматлікія экалагічныя праекты, не дазваляюць у сённяшніх умовах зрабіць гэты працэс паўсюдным. Таму вызначаюцца прыярытэтныя кірункі, ці, як прынята сёння казаць, драйверы, пілотныя раёны, гарады. Адносна апошніх узнікае пытанне: наколькі абгрунтаваным з'яўляецца іх выбар? Вядома, што гэта робіцца не адным чалавекам, а калектывам спецыялістаў. стар. 14

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Хто ў двары старшы?

Гэта «званне» прысвойваюць у Заводскім раёне сталіцы самым нераўнадушным. стар. 2

Ці хопіць бульбы?

Чаму ў нарыхтоўшчыкаў адсутнічае прадукцыя стабілізацыйных фондаў — высвятлялі спецыялісты Камітэта дзяржкантролю. стар. 3

Здалі — прынялі

Пра асаблівасці збору лішкаў малака ў Бабруйскім раёне. стар. 4

У лес... па прыгоды?

Без «сезонных» здарэнняў не абыходзіцца. стар. 15

Прыгожа, весела, смачна!..

У Карэліцкім раёне зладзілі свята кветак і яблычны фэст. стар. 16

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Дасягаць Мэт з моладдзю

Намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, Нацыянальны каардынатар па Мэтах устойлівага развіцця Мар'яна ШЧОТКІНА ўзяла ўдзел у форуме «Інавацыі падлеткаў і моладзі для дасягнення Мэт устойлівага развіцця».

Мерапрыемства адбылося 15 жніўня ў Нацыянальным дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Зубраня» і аб'яднала 150 падлеткаў. Яны прадставілі свае ідэі і праекты па дасягненні Мэт устойлівага развіцця ў розных сферах — аховы навакольнага асяроддзя, здаровага ладу жыцця, якаснай адукацыі і іншых. У рамках форуму адбыўся таксама круглы стол, які сабраў маладзёжных паслоў МУР.

Мар'яна Шчоткіна падзякавала ўдзельнікам форуму за актыўнасць і адзначыла асаблівую ролю моладзі ў рабоце па дасягненні Мэт устойлівага развіцця. «Мы хочам пачуць моладзь і вызначыць тыя тэмы, кірункі, якімі будзем разам займацца, — сказала яна. — Мы чакаем яркіх выступленняў, ініцыятыў. Калі маладым людзям цікавыя гэтыя пытанні, значыць, будзе над чым працаваць».

У Беларусі на розных узроўнях праводзіцца работа па ўключэнні моладзі ў дзейнасць па дасягненні Мэт устойлівага развіцця. «Важна інфармаваць маладых людзей, школы, садкі аб Мэтах устойлівага развіцця, бо за моладзю — наша будучыня», — падагульніла Мар'яна Шчоткіна.

Пытанні надзённыя і глабальныя

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімір Панцюхоў узяў удзел у адзіным дні інфармавання і правёў сустрэчы з выбаршчыкамі Краснапольскага і Касцюковіцкага раёнаў Магілёўскай вобласці. Пра гэта паведамляе прэс-служба верхняй палаты парламента.

На мерапрыемстве абмяркоўваліся пытанні комплекснага развіцця паўднёва-ўсходніх рэгіёнаў вобласці, стварэння спрыяльных умоў для пражывання насельніцтва ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 8 чэрвеня 2015 г. № 235 «Аб сацыяльна-эканамічным развіцці паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўскай вобласці».

Падчас сустрэчы выбаршчыкі задавалі пытанні аб зменах у Падатковым кодэксе Рэспублікі Беларусь, перараслiку рабочых пенсій, актывізацыі работы аўтакрам і машын па развозе хлеба, стварэнні новых дадатковых працоўных месцаў, развіцці вытворчасці дрэваапрацоўкі, вызваленні ад штрафных санкцый і выкананні сацыяльных стандартаў. Асобна было пастаўлена пытанне аб неабходнасці стварэння грамадскага аб'яднання абаронцаў памяці і праўды пра Вялікую айчынную вайну.

Усё дрэннае міне

Віцэ-спікер савета Рэспублікі наведала дзіцячы прытулак

Такія візіты досыць складаныя. Па-першае — дзеці, якія не церпяць паказухі і няшчырасці. Па-другое — прытулак. Гэта значыць, што дзеці знаходзяцца ў бядзе. Ужо ў бяспецы і дастатку, але яшчэ не з бацькамі, і невядома пакуль дакладна, як складзецца іх жыццё далей.

Фота БелТА.

Дырэктар сацыяльна-педагагічнага цэнтра з прытулкам Фрунзенскага раёна Мінска Марына Станкевіч кажа, што 85 працэнтаў яе падапечных вяртаюцца ў родныя сем'і. Яшчэ адна станоўчая тэндэнцыя — колькасць дзяцей, якія трапілі ў небяспечную сітуацыю, змяншаецца. Цяпер у сценах СПЦ 15 непаўналетніх: ад 3 да 16 гадоў. І канешне, тут ім створаны добрыя ўмовы, з імі працуюць педагогі і псіхолагі, большасць з іх наведваюць бацькі, але ўсё роўна — дзеці нібыта прыціснутыя тым, што з імі адбылося, яны сумуюць па родных і сябрах, яны баяцца, што могуць ніколі больш не вярнуцца дадому...

Мар'яна Шчоткіна адразу пастаралася разняволіць атмасферу, скараціць дыстанцыю паміж сабой і насельнікамі прытулку. Дзеці падрыхтавалі нумары? Добра, але яна хоча сесці так, каб бачыць усіх. І з кожным пазнаёміцца асабіста. І распытаць пра захапленні. І падарункі былі індывідуальныя. І дзеці, спачатку трошкі напружаныя і заціснутыя, хутка раскрыліся, заўсміхаліся і сталі з задавальненнем расказваць пра сябе і свае захапленні.

— Па ўсёй краіне набірае сілу акцыя па дапамозе ў падрыхтоўцы дзяцей да школы, — сказала потым віцэ-спікер журналістам. — Кожны член Савета Рэспублікі возьме ў ёй удзел: нехта наведае школьную лінейку, нехта дзіцячы дом. Адначасова Беларускі Саюз жанчын па ўсёй краіне ўдзельнічае ў акцыі «Збяром партфель разам». Сёння мы прыйшлі ў СПЦ, да дзяцей, якіх часова забралі з сям'і, яны знаходзяцца ў складанай сітуацыі і маюць патрэбу ў асаблівай увазе. Перш чым прыйсці да іх, мы спыталі, чаго яны хочуць.

Віцэ-спікер верхняй палаты парламента ўручыла кожнаму дзіцяці па спартыўным касцюме, прычым усім — розныя. Акрамя таго, прытулак папоўніўся ўтульнымі крэсламі-падушкамі. Але, напэўна, самае важнае ў гэтай сустрэчы — атмасфера і пачуццё, што ты не адзін, тваё жыццё важнае для іншых людзей, нават тых, хто цябе не ведае асабіста. Не ведаў дагэтуль.

— Вельмі важна, каб кожнае малое ішло ў школу з добрым настроем і было да яе падрыхтаванае, — лічыць Мар'яна Шчоткіна. — Менавіта таму Прэзідыум Беларускага саюза жанчын рыхтуе праграму наведвання дзяўчат у дзіцячай закрытай установе ў Петрыкаве.

Намеснік старшыні Савета Рэспублікі згадала словы з песні, якую яна пачула тут, у СПЦ, з вуснаў дзяцей: «Мы падрасцём і ўсё паправім». «Дзяцінства — гэта такі час, калі людзі вераць у светлую мару, калі яны мараць. І мы павінны абавязкова ў гэтым дапамагчы. І самае галоўнае, кожнае дзіця павінна адчуць цеплыню і падтрымку. Яно павінна прыйсці першага верасня ў школьны клас з добрым настроем і ўпэўненасцю, што не адзінокае ў гэтым свеце», — дадала палітык.

СТАЦЬ БЛІЖЭЙ

СТАРШЫ Ў ДВАРЫ

не па гадах і званнях, а па нераўнадушшы і сумленні

Неабыякавыя да стану сваіх і суседскіх двароў людзі ў верасні — кастрычніку могуць набыць грамадскія паўнамоцтвы — наўпрост кантактаваць з камунальнымі службамі Заводскага раёна сталіцы і ўказваць ім на вулічныя праблемы: адчыненыя дзверы, зламаную лаўку, перавернутую сметніцу, пахіснуты слуп, няскошаную траву...

У сталіцы ўжо паспяхова працуюць такія арганізацыі, як КОТГСы — калегіяльныя органы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, якія функцыянуюць на добраахвотных пачатках. Некалькі гадоў таму асвоілі практыку выбараў старшых па пад'ездах. Цяпер на чарзе — сталічныя дворы.

— У нас ужо ёсць кандыдаты на абранне старшымі па дварах. Гэта ініцыятыўныя жыхары, неабыякавыя да лёсу двара. Яны будуць нам падказваць, а мы — выконваць іх звароты, — тлумачыць новаўвядзенне **Міхаіл ВАРЫКАШ, дырэктар жыллёва-камунальнай гаспадаркі Заводскага раёна Мінска.** — Такім чынам мы выходзім на адкрыты дыялог з грамадзянамі і разлічваем, што праз гэта вялікая колькасць зваротаў, якая існуе цяпер, зменшыцца. Мы сумесна будзем наводзіць парадак, і тады жыць у нашым раёне стане лепш.

Абірацца старшыя будуць на агульных сходах грамадзян самімі жыхарамі і прадстаўнікамі камунальных службаў, бо ўсе яны ведаюць ініцыятыўных суседзяў і здольныя прапанаваць найлепшыя кандыдатуры на пост «галавы двара».

— Людзі, якія тут жывуць, штодня ідуць на работу, заўважаюць усё і адразу нам паведамяць аб праблеме. Камунальныя службы і ствараліся для насельніцтва, каб мы чулі іх і выконвалі запыты. І мы зусім не супраць, калі нам будуць хутка паведамляць аб праблеме. Магчыма, мы дзесьці самі нешта не дагледзелі, не заўважылі, — разважае дырэктар. — Галоўнае — вырашыць пытанне і патлумачыць людзям, што сёння мы не можам адрамантаваць гэтую лаўку, а вось праз два тыдні ці месяц — калі ласка. Аднак абяцанне такое трэба выконваць, тады будзе разуменне.

Звароты грамадзян будуць адпрацоўвацца камунальнікамі сумесна са службай «115», каб не пакінуць без увагі ніводную просьбу. Абраць старшых па дварах плануюць за верасень — кастрычнік, а атрымаць першыя вынікі ад іх работы — ужо да канца гэтага года. Аднак рэальна пабачыць, ці прыносіць карысць дзейнасць актыўных жыхароў і ці варта распаўсюджваць вопыт Заводскага раёна на ўсю сталіцу, можна будзе не раней чым праз паўгода.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

САРДЭЧНА ЗАПРАШАЕМ!

Паўночныя «фішкі» агрясядзіб

У Віцебскай вобласці зарэгістравана каля 620 агрясядзіб, у тым ліку чатыры — на базе сельскагаспадарчых арганізацый. Амаль палова з іх знаходзіцца ў Браслаўскім, па 44 — у Мёрскім і Пастаўскім раёнах. А вось у Талачынскім сёлета з'явілася першая.

Добрай навіной для гаспадароў у пачатку мінулага года стаў уступіўшы ў сілу прэзідэнцкі Указ № 365 «Аб развіцці аграэкатурызму» (ад 9 кастрычніка 2017 года). Дзякуючы яму істотна спрашчаецца аказанне паслуг у гэтай сферы. Паралельна пашыраны пералік паслуг, якія могуць аказвацца.

На жаль, не ўсе сядзібы працуюць. З агульнай колькасці летась дзейнічала толькі 80 %. Напрыклад, у Браслаўскім раёне ў 2018 годзе колькасць сядзіб паменшылася на 17. Гэта адбылося таму, што некаторыя суб'екты аграгурызму не адпавядалі патрабаванням Указа № 365.

Таксама летась у сядзібах прынялі каля 42,2 тысячы гасцей. Параўнайце: пазалетась іх было 33,1 тысячы, а ў 2016 годзе — прыблізна 31,7 тысячы. Сярэдняя працягласць пражывання: у 2018-м — больш за дзевяць дзён і прыблізна па пяць з паловай дзён у 2016 і 2017 гадах. Значыць, бізнес становіцца больш выгадным. А падатак — усяго толькі базавая велічыня ў год.

У многіх раёнах гаспадары агрясядзіб, каб менавіта да іх прыехалі адпачыць, шукаюць «фішкі». І прыкладаў гэтаму ўсё больш. Напрыклад, масавым стаў леташні чэмпіянат краіны па яздзе па бездарожжы, які прайшоў на базе сядзібы «Канашы» ў Полацкім раёне. Новым турыстычным прадуктам стала анімацыйная праграма «Адраджэнне полацкага сярэдневяковага судаходства». Крэатыўнічаюць і ў суседнім Глыбоцкім раёне. Сядзіба «Утрына» стала сталіцай экалагічнага фестывалю «ЭкаЛэнд». У яго рамках правялі кулінарны конкурс сярод гаспадароў аграрных сядзіб і жыхароў раёна. А ў сядзібы «Запаветны востраў» і «Цэнтр Еўропы» летась на міжнародны фестываль прыехала каля сарака дайвераў з Беларусі, Расіі і Украіны. Нагодай стала магчымасць пагрузіцца ў самае глыбокае беларускае возера — Доўгае.

У Мёрскім раёне на «Мацейкавай сялібе» арганізавалі летні сямейны лагер. У праграме былі рухомыя гульні, майстар-класы па валянні воўны, спектаклі і экскурсіі па знакавых мясцінах раёна. А на Пастаўшчыне ў агрясядзібе «Акарына» праводзяцца майстар-класы па ганчарным мастацтве...

У камітэце эканомікі Віцебскага аблвыканкама лічаць, што адным з самых перспектыўных кірункаў развіцця турызму павінен стаць так званы экалагічны. Такі від адпачынку называюць яшчэ «зялёным» — гэта калі і самі турысты прыносяць мінімум шкоды навакольнаму асяроддзю. Яго магчыма развіваць у раёнах з некранутай прыродай, з сельскагаспадарчай накіраванасцю (апошніх у Віцебскай вобласці большасць — 12 з 21).

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЗАПАС БЯДЫ НЕ ЧЫНІЦЬ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Гароднінай і бульбай Беларусь можа і сябе забяспечыць, і сьвяроў. А што ў краіне робіцца з лішкам сельгаспрадукцыі, вырашчанай на ўласных падворках? Нічога не губляем?

— Сапраўды, у рэспубліцы вытворчасць бульбы і гародніны дазваляе ў поўным аб'ёме забяспечыць патрэбы ўнутранага рынку і мець свабодныя рэсурсы для пастаўкі на экспарт. Лішкі прадукцыі, выгадаванай і вырашчанай у асабістых гаспадарках грамадзян, штогод закупляюцца Белкаапсаюзам.

— Як ідзе закладка стабілізацыйных фондаў (запасаў) харчовых тавараў сёлета, з якім запасам будзем узімку?

— Цяпер вядзецца работа па фарміраванні аб'ёмаў закладкі асноўных відаў плодаагародніннай прадукцыі для стабілізацыйных фондаў на міжсезонны перыяд 2019—2020 гадоў, якія будуць зацверджаны аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам да 1 верасня. Стабілізацыйныя фонды дазваляюць уплываць на рознічныя цэны ўнутранага рынку краіны і пазбягаць іх неабгрунтаваных скачкоў. Штогод стабілізацыйныя фонды закладваюцца ў запланаваных аб'ёмах.

— Чалавек не толькі вырасціў бульбу ці яблыкі, а яшчэ і трымае карову або некалькі, застаюцца лішкі малака, — куды і на якіх умовах іх можна здаць?

— Грамадзяне, якія ажыццяўляюць вядзенне ўласных падсобных гаспадарак, могуць па сваім жаданні рэалізоўваць малако з прыватнага падворка юрыдычным і фізічным асобам, а таксама індывідуальным прадпрымальнікам згодна з заключанымі з імі дагаворамі. Гэта прадугледжана артыкулам 6 закона аб асабістых падсобных гаспадарках грамадзян.

Малакаперапрацоўчыя арганізацыі краіны прымаюць сырое каровіна малако як ад сельскагаспадарчых арганізацый, так і ад насельніцтва ў адпаведнасці з патрабаваннямі СТБ 1598-2006 «Малако каровіна сырое. Тэхнічныя ўмовы». Для забеспячэння кантролю якасці такога малака, прынятага ад насельніцтва, вытворчыя лабараторыі сельскагаспадарчых арганізацый акрэдытаваны для вызначэння адпаведных паказчыкаў.

— Падпраграма 10 «Развіццё і падтрымка малых формаў гаспадарання» Дзяржаўнай праграмы развіцця аграрнага бізнесу на 2016—2020 гады прадугледжвае выплату надбавак да закупачных цэн грамадзянам, якія рэалізуюць малако. Як яны вызначаюцца?

— Памер надбавак штогод вызначаецца Мінсельгасхарчам у межах сродкаў, прадугледжаных у рэспубліканскім бюджэце на развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці, рыбаводства і перапрацоўку сельскагаспадарчай прадукцыі. Так, пастановай Мінсельгасхарча аб надбаўках да закупачных цэн на сельскагаспадарчую прадукцыю насельніцтва ў 2019 годзе памер надбаўкі да закупачнай цаны за 1 кілаграм малака базіснай тлустасці (3,6 працэнта) складае 0,04 рубля.

Парадак разліку асобамі, якія закупілі малако ў насельніцтва, ажыццяўляецца ў адпаведнасці з пастановай Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь ад 4 красавіка 2018 года № 35. У 2018 годзе ў насельніцтва было закуплена 165,3 тысячы тон малака для далейшай перапрацоўкі і вытворчасці малочных прадуктаў і выплачаныя надбаўкі да закупачных цэн у памеры 6205 тысяч рублёў.

— Цікавыць чытачоў адносна новыя для нас культуры кшталту кавуноў. Якая ў іх сёлета ўраджайнасць, якое месца на рынку яны зоймуць?

— Так, у 2019 годзе ў сельскагаспадарчых арганізацыях і сялянскіх (фермерскіх) гаспадарках будзе выраблена каля 450 тон бахчавых культур. Пасадкі бахчавых культур сканцэнтраваны ў асноўным у Брэсцкай (больш за 70 працэнтаў усіх плошчаў), Гомельскай, Гродзенскай і Мінскай абласцях. Летась бахчавымі культурамі (у асноўным кавунамі) было занята 35,9 гектара (85 працэнтаў ад узроўню 2017 года). Вытворчасць гэтых культур склала 421,1 тоны (100,1 працэнта ад узроўню 2017 года) пры сярэдняй ураджайнасці 125 цэнтнераў з гектара.

Найбуйнейшыя вытворцы кавуноў у нашай краіне — прадпрыемствы «Чарняны» Маларыцкага раёна, «Цяплічны камбінат «Бярэсце» Брэсцкага раёна, «Дружба і К» Смалявіцкага раёна, а таксама «Гродзенская аграднінная фабрыка».

Вырошчванне бахчавых культур — вытворчасць працаёмкая, патрабуе значнага прымянення ручной працы: ад пасеву (высадкі расады) з выкарыстаннем часовых плёначных хованак і да ўборкі.

— У краіне пачалі вырошчваць цвёрдыя сарты пшаніцы. Ці хутка будзе ў нас макарона з беларускага збожжа?

— Сёння да выкарыстання ў сельскагаспадарчай вытворчасці дапушчана больш за 100 сартоў мяккай пшаніцы айчыннай і замежнай селекцыі, тады як цвёрдай пшаніцы дапушчана толькі восем сартоў. Сельскагаспадарчыя арганізацыі краіны паспяхова займаюцца вырошчваннем пшаніцы мяккіх сартоў для вытворчасці збожжа харчоваga і кармавога прызначэння (пасяўная плошча складае больш за 660 тысяч гектараў).

Вырошчванне пшаніцы цвёрдых сартоў у сельскагаспадарчай вытворчасці не ажыццяўлялася ў сувязі з неспрыяльнымі для яе глебава-кліматычнымі ўмовамі, невысокай прадукцыйнасцю збожжа (12—15 ц/га), а таксама недастатковай якасцю гэтага збожжа для наступнага выкарыстання яго перапрацоўчымі арганізацыямі.

Селекцыяй сартоў цвёрдай пшаніцы сёння ў краіне займаецца Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія, якая стварыла тры сарты (Славіца, Разалія, Валента), уключаныя ў дзяржаўны рэестр сартоў. Таксама ў гэты рэестр уключаны тры сарты (Амазонка, Аксініт, Агат Данскі) селекцыі Усерасійскага НДІ збожжавых культур імя І. Г. Каліненкі, два сарты (Мерыдыяна, Ірыдэ) селекцыі італьянскай фірмы Societa Produttori Sementi S. P. A.

— А ўвогуле, з якім «караваем» будзем зімаваць?

— Заданне на пастаўку збожжа для рэспубліканскіх дзяржаўных патрэб у аб'ёме 815 тысяч тон будзе выканана — гэта дазволіць забяспечыць патрэбу ўнутранага рынку ў мукамольна-крупяной прадукцыі да новага ўраджаю ў поўным аб'ёме.

Паводле аператыўнай інфармацыі, па стане на 14 жніўня 2019 года арганізацыямі-нарыхтоўшчыкамі для рэспубліканскіх дзяржаўных патрэб закуплена 660,2 тысячы тон харчовага збожжа, што складае 81 % ад устаноўленага задання, у тым ліку па Брэсцкай вобласці — 89,1 тысячы тон (92,8 %), Віцебскай — 80,2 тысячы тон (69,7 %), Гомельскай — 74,3 тысячы тон (63 %), Гродзенскай — 130,9 тысячы тон (95,5 %), Мінскай — 176,6 тысячы тон (95,5 %), Магілёўскай — 109,1 тысячы тон (66,5 %).

Харчовай пшаніцы ў лік дзяржзаказу паступіла 414,8 тысячы тон (85,4 % ад задання), жыта — 212 тысяч тон (86,5 %), ячменю — 17,4 тысячы тон (60 %), аўса — 16 тысяч тон (36,8 %).

Варвара МАРОЗАВА.

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ!

БУЛЬБЫ ХОПІЦЬ УСІМ?

Адсутнасць прадукцыі стабілізацыйнага фонду ў нарыхтоўшчыкаў, незабеспячэнне рытмічных паставак у гандлёвыя пункты пры павышаным попыце на айчынную сельгаспрадукцыю пацягнула сёлета рост кошту на некаторыя яе віды ў 3-5 разоў.
І у першую чаргу праз павелічэнне гандлёвых надбавак суб'ектамі гандлю. Да такога выводу прыйшлі спецыялісты Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці.

Там канстатуюць, што не выконваюцца даручэнні Прэзідэнта па забеспячэнні насельніцтва якаснай айчыннай сельскагаспадарчай прадукцыяй, падтрымцы яе вытворцаў і скарачэнні долі імпарту. Гэта высветлілася ў выніку кантрольных мерапрыемстваў, праведзеных у першым паўгоддзі.

Начальнік упраўлення кантролю за работай галін гаспадаркі Камітэта дзяржкантролю Віцебскай вобласці Вадзім ВАЛОВІЧ растлумачыў, што непрыняцце мясцовай уладай належных мер па аказанні айчынным вытворцам падтрымкі па прасоўванні вырашчанай прадукцыі ў рознічную гандлёвую сетку, і ў першую чаргу да буйных гандлёвых рытэйлераў, цягне паўсюднае яе замяшчэнне імпартнай.

Трохі гісторыі ў тэму. Раней у мэтах бесперабойнага забеспячэння насельніцтва айчыннымі прадуктамі ў міжсезонны перыяд пачынаючы з 1998 года пад непасрэдным кіраўніцтвам Савета Міністраў у абласцях і Мінску пачалі стварацца стабілізацыйныя фонды харчовых тавараў. У іх першапачаткова закладваліся мяса, жывёльнае масла, сычужныя цвёрдыя сыры, сухое малако, тварог, гароднына, садавіна, бульба, цукар. Потым Саўмінам былі выключаны прадукты жывёлагадоўлі і цукар. А спіс прадуктаў раслінаводства, акрамя бульбы і садавіны, быў дапоўнены капустай, морквай, буракамі, цыбуляй.

> З 2016 года, пасля таго як функцыі па стварэнні стабфондаў харчовых тавараў былі перакладзеныя ўрадам на аблвыканкамы і Мінскі гарвыканкам, работа па іх фарміраванні і выкарыстанні пераважна стала фармальнай і праводзілася для выгляду.

— Камітэтам вобласці выкрываліся факты фармальнага заключэння дагавораў: як паміж захавальнікамі і вытворцамі прадукцыі, так і паміж захавальнікамі прадукцыі стабфонду і гандлёвымі арганізацыямі. Фактычна дагаворныя адносіны не выконваліся, штрафныя санкцыі за невыкананне ўзятых бакамі на сябе абавязацельстваў не прымяняліся... Кантрольнымі мерапрыемствамі ўстаноўлена, што шмат у якіх захавальнікаў на момант наведвання адсутнічала ў даведзеным мясцовымі органамі ўлады аб'ёме прадукцыя стабфонду, — працягвае Вадзім Валовіч.

Пры гэтым адбывалася і штогадовае зніжэнне аб'ёмаў стабфондаў. Напрыклад, на міжсезонны перыяд 2018/2019 гадоў, у параўнанні з 2017/2018 гадамі Віцебскім аблвыканкамам зніжаны аб'ёмы прадукцыі па большасці яе відаў (акрамя морквы і буракоў). У прыватнасці, па рэпчатай цыбулі на 100 тон (з 2400 да 2300), бульбе — на 660 т (з 8500 да 7840 т), белакачаннай капусце — на 730 тон (з 4500 да 3770). А па яблыках — на 920 т, і гэта ў параўнанні з перыядам 2016/2017 гадоў менш напалову!

Раней, калі гэтыя аб'ёмы зацвярджаліся Саўмінам, яны былі вышэйшыя ў разы.

> У цэлым праведзеныя кантрольныя мерапрыемствы паказалі, што грамадзяне не ў поўным аб'ёме забяспечваюцца якасным айчынным харчаваннем. Адпаведна, асноўная задача стварэння запасаў прадукцыі стабфонду не дасягнутая, у тым ліку з прычыны зніжэння яго аб'ёмаў.

Вынікі кантрольных мерапрыемстваў разгледжаны на пасяджэнні калегіі Камітэта з удзелам кіраўніцтва аблвыканкама, гарадскіх і раённых выканкамаў, іншых арганізацый і прадпрыемстваў. Унесены канкрэтныя прапановы па выпраўленні сітуацыі, якая склалася.

У мэтах выканання рэкамендацый Камітэта дзяржкантролю пры зацвярджэнні ў жніўні аб'ёмаў і наменклатуры стабілізацыйных фондаў (запасаў) прадукцыі раслінаводства для рэалізацыі ў міжсезонны перыяд 2019/2020 гадоў аблвыканкам павялічыў у параўнанні з закладзенымі летась аб'ёмы: бульбы — на 60 тон, яблыкаў — на 70 тон, цыбулі рэпчатай — на 100 тон, капусты — на 330 тон...

Выканкамам даручана забяспечыць заключэнне паміж суб'ектамі гаспадарання (якія ажыццяўляюць вытворчасць, захоўванне, рэалізацыю прадукцыі раслінаводства) адпаведных дагавораў, што прадугледжваюць аб'ёмы, віды (гатункі) прадукцыі, канкрэтную матэрыяльную адказнасць за невыкананне бакамі абавязацельстваў. Новы ўраджай трэба закласці ў сховішчы да 1 лістапада.

Кантраляваць пытанне вельмі пільна будуць і надалей.

Ці ёсць са здачай прыватнай прадукцыі праблемы? У Віцебскім абласным саюзе спажывецкіх таварыстваў купяць усё і ва ўсіх, хто пажадае здаць лішняе. Праблем з транспартам, аплатай і тым, дзе захоўваць прадукцыю, не будзе. Увогуле, больш за 70 % у агульных аб'ёмах нарыхтоўчага абароту спажывецкай кааперацыі — прадукцыя, якая закупляецца ў насельніцтва. Спажывецкая кааперацыя ў вобласці з'яўляецца асноўным нарыхтоўшчыкам бульбы, гароднины, садавіны, ягад, грыбоў і іншай прадукцыі.

Каб набыць і захаваць ураджай, у Віцебскай вобласці дзейнічае каля дзевяноста прыёмных нарыхтоўчых пунктаў, каля дваццаці сховішчаў. Ёсць дзе, дарэчы, і прадаць вырашчаную на ўласным падворку прадукцыю: 1400 гандлёвых месцаў даецца грамадзянам для яе рэалізацыі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

САБРАЦЬ І ЗАХАВАЦЬ

Ядомая «падушка бяспекі»

Што яна сабой уяўляе?

Кожны год у краіне зацвярджаюцца стабілізацыйныя фонды харчовых тавараў. Такая традыцыя прыйшла да нас з савецкіх часоў, калі запас правізіі не даваў гарадскім жыхарам галадаць у міжсезонне. Але і цяпер у яго стварэнні ёсць свае плюсы: па-першае, так танней. Ну і падушка бяспекі на выпадак форс-мажору ніколі не пашкодзіць.

Эканамісты з розных ведамстваў кожны год з красавіка падлічваюць, колькі і чаго неабходна для стварэння чарговага стабфонду. Абласныя выканаўчыя камітэты, вывучыўшы дэталёва сітуацыю кожны ў сваім рэгіёне, прапануюць альбо павялічыць закладку, альбо паменшыць. А затым Савет Міністраў прымае канчатковае рашэнне.

Аб'ём стабілізацыйнага фонду павінен быць прадуманы. Каб і гародніны хапіла, і рэшткі не засталіся. Гэта значыць, звышнарматыўная колькасць не павінна быць занадта вялікая, інакш тавар пачне залежвацца, а сельская гаспадарка панясе страты.

Фонд складаецца з прадуктаў першай неабходнасці, якія можна захоўваць доўга, такіх як гародніна, садавіна, мяса і сметанковае масла. Стратэгічныя запасы для жыхароў буйных гарадоў і галоўнага мегаполіса нашай краіны знаходзяцца на холадакамбінатах і сучасных складах, паступова перамяшчаючыся на прылаўкі магазінаў і ў сталоўкі дзяржустаноў.

Нормы з года ў год амаль не мяняюцца. Сёлета, праўда, збіраюцца папоўніць запасы яблыкаў, бо цяпер у крамах беларускіх сартоў павінна быць у два разы больш. Гародніна і садавіна тут — з беларускіх прадпрыемстваў, большасць якіх — былыя калгасы. Але ёсць і прыватныя фермерскія гаспадаркі. Прадукты ад пастаўшчыкоў спачатку адпраўляюць у лабараторыю на аналіз, каб пераканацца ў адсутнасці нітратаў і радыенуклідаў. (Калі іх знайшлі — вяртаюць вытворцу.) Затым гародніну і садавіну сартуюць, каб прыбраць падгнілую і пакамечаную, пакуюць у скрыні і адпраўляюць на склад.

Напрыклад, у фасовачным цэху бульбу падрыхтоўваюць да «паездкі» ў крамы. Яе мыюць, сушаць, а потым уручную адбіраюць буйныя бульбіны на канвееры і пакуюць іх у мяшкі-сетачкі. Дарэчы, некандыцыя таксама не знікае: яе перапрацоўваюць на крухмал. У выніку цана бульбы вырастае амаль у пяць разоў: закупляюць яе за 20 капеек, а прадаюць ужо па рублі. Яблыкі ў працэсе закладкі даражэюць прыблізна ў тры разы.

Для кожнай гародніны патрэбен свой рэжым захоўвання. Напрыклад, бульбе патрабуецца ад трох да шасці градусаў цяпла і высокая вільготнасць, цыбулі — сухое памяшканне пры нулявой тэмпературы, а яблыкам — герметычныя камеры з паменшаным утрыманнем кіслароду і павялічаным — дыяксіду вугляроду. У такіх умовах ёсць шанц зберагчы бульбу на год, а яблыкі — да дзевяці месяцаў. У асобных спецыялізаваных памяшканнях знаходзяцца запасы мяса, сыру і сметанковага масла. Захоўваюцца прадукты ў вялікіх халадзільных камерах пры тэмпературы мінус 17 градусаў.

У стабілізацыйны фонд Беларусі закладваецца ў асноўным раслінаводчая прадукцыя. На мяса ўпор не робіцца, таму што яго на мясакамбінатах для забеспячэння насельніцтва больш чым дастаткова.

У тэму

У мэтах рацыянальнага выкарыстання запасаў харчовых тавараў Саўмін штогод прымае рашэнне аб тым, што аблвыканкамы і Мінскі гарвыканкам павінны стварыць у абласцях і сталіцы стабілізацыйныя фонды прадуктаў для рэалізацыі на тэрыторыі краіны, забяспечыць кантроль за выкананнем патрабаванняў тэхнічных нарматыўных прававых актаў, рэгуляваць умовы іх захоўвання.

Акрамя таго, рэгіянальныя ўлады да 1 верасня распрацоўваюць канкрэтныя аб'ёмы і наменклатуру стабілізацыйных фондаў, а таксама пералікі арганізацый, якія ажыццяўляюць іх захоўванне. З сярэдзіны лістапада імі рыхтуюцца і зацвярджаюцца графікі штомесячнага выкарыстання аб'ёмаў харчовых тавараў і забяспечваецца кантроль за іх выкананнем — у перыяд з 15 лістапада да 31 мая ўключна.

Кантроль за выкананнем такіх рашэнняў, забеспячэннем спажывецкага рынку харчовымі таварамі ў міжсезонны перыяд ускладзены на аблвыканкамы і Мінскі гарвыканкам.

Сяргей КУРКАЧ.

МАЛОЧНЫ РЭЙС,

або Асаблівасці збору лішкаў малака ў Бабруйскім раёне

На фоне таго, як імкліва сельскае насельніцтва пазбаўляецца ад буйной рагатай жывёлы, Бабруйскі раён сапраўды можна лічыць самым малочным у Магілёўскай вобласці. Тут яшчэ хапае жыхароў, якія трымаюць кароў і рэальна падпрацоўваюць на лішках малака. Штомесячна яны здаюць дзяржаве больш за 202 тысячы тон карыснага прадукту.

Ад шасці рублёў за вядро

За рабочы дзень прадпрымальнік Віктар Фіська «накручвае» на сваім аўто 370 «малочных» кіламетраў. Прычым усе сем дзён на тыдзень — карова ж «працуе» без выхадных. Устае Віктар а палове чацвёртай і ўжо праз паўгадзіны даязджае да першага кліента. З напарнікам абслугоўваюць Глускі і Бабруйскі раёны. А здаюць прадукт філіялу ААТ «Бабуліна крынка», што ў Асіповічах.

— За дзень паспяваю наведаць 17 населеных пунктаў, — удакладняе суразмоўца. —Аб'ёмы ўсюды розныя, у адных вёсках забіраю 50-100 літраў, у іншых 400-600. Хтосьці трымае адну карову, а хтосьці пяць. Адна карова ў сярэднім дае 12-15 літраў.

На 20 жніўня малако каштавала 50 капеек за літр. Гэта прыблізна шэсць рублёў за вядро малака. Разлік з чалавекам, удакладняе прадпрымальнік, кожныя 10 дзён. Вядома, насельніцтва не вельмі задаволена цаной, але зразумець людзей можна. Крыўдна, што карысны натуральны прадукт каштуе танней, чым газаваная вада. Ваду ўзяў ды разліў па бутэльках, а карову яшчэ накарміць трэба і дагледзець. Але ж ад зборшчыка малака тут нічога не залежыць.

Людзі, каб атрымаць больш грошай, бывае, ідуць на хітрыкі. Напрыклад, разбаўляюць малако вадой. Але Віктар — чалавек вопытны і такія спробы адразу ж спыняе. Якасць вызначае як візуальна, так і з дапамогай спецыяльнага прыбора, які паказвае тлустасць прадукту, а таксама сігналізуе, калі ў малацэ прысутнічае вада.

— За дзевяць гадоў работы я ўжо і без прыбора навучыўся выяўляць, якой тлустасці малако, — усміхаецца мужчына. — Дарэчы, калі тлустасць добрая, яшчэ і надбаўка ідзе. Напрыклад, калі чалавек здаў 100 літраў малака тлустасцю больш за 3,7 %, атрымлівае грошы як за 130 літраў.

Суразмоўнік з сумам у голасе адзначае, што колькасць малака ад насельніцтва паступова скарачаецца. Яшчэ летась ён вазіў на прыёмны пункт 3,5 тоны малака, а сёлета ў сярэднім 2,9 тоны. Для параўнання: дзевяць гадоў таму лічба была 3,8 тоны.

Галіна МІХАЛЁНАК займаецца зборам малака ў Варатынскім сельсавеце ўжо восем гадоў.

Сямейная справа

Малако — гэта золата, лічыць жыхарка вёскі Восава Гарбацэвіцкага сельсавета Ганна Занкевіч. Яе гаспадарка лічыцца сялянска-фермерскай — сям'я трымае аж 22 каровы.

— Кожны дзень здаём па 150-200 літраў малака, — кажа фермер. — Нам вельмі зручна. Падаілі кароў, выставілі баклагі на спецыяльныя сталы, паперкі паклалі і займаемся сваімі справамі. А зборшчык прыехаў і ўсё забраў. 50 капеек за літр — гэта

Віктар ФІСЬКО вядзе прыём малака ў насельніцтва.

няшмат, але зімой даюць датацыі — надбаўку за кожны літр малака. Так, як і ў калгасах.

Фермерскі стаж у Ганны Васілеўны і яе мужа 30 гадоў. Была справа, і свіннямі займаліся, але сапраўдны прыбытак прыносіць толькі малако, запэўнівае жанчына.

— Гэта адзіны прадукт, на які попыт не падае, — кажа яна. — Маладняк прадаём насельніцтву. Бычкоў пускаем на мяса, а цёлак хоць і рэдка, але ж купляюць, каб вырасціць кароўку.

Бізнес у Занкевічаў сямейны, бацькам дапамагаюць дачка і яе дарослы сын. Плюс адзін памочнік збоку, які працуе на паўстаўкі.

— У нас забяспечаная гаспадарка, сена рукамі не збіраем, — усміхаецца жанчына. — Толькі адзін трактар з чатырох і прэс па лізінгу купілі, астатняе ўсё набылі за жывыя грошы. Сваімі сіламі, без крэдытаў, пабудавалі склады, гараж, ферму. Іншыя ўкладваюць грошы ў кватэры, нерухомасць, а мы вырашылі: калі гэта наша рабочае месца, трэба забяспечыць яго ўсім неабходным. Дом у нас таксама ёсць, але не нейкі там палац двухпавярховы, а вялікая сялянская хата.

Кароў, дарэчы, Занкевічы таксама нідзе не купілі — вырасцілі самастойна. І цяпер плануюць павялічыць статак да 30 жывёл.

— І на дарослых кароў, і на маладняк нашых нарыхтовак хопіць, — разважае Ганна Васілеўна. — Цяпер калгасы насельніцтва збожжам не забяспечваюць, а мы яго прадаём. Каму для курэй трэба, каму для парсючка. Ахвотных трымаць кароў, на жаль, усё менш. Старым працаваць ужо цяжка, а моладзь прывыкла купляць усё ў крамах. Хаця карова спрадвеку лічылася ў сям'і карміцелькай. Калісьці ў нашым Восаве статак быў 150 галоў, а цяпер засталося, напэўна, кароў 30.

Размаўляю з Ганнай Васілеўнай, і нават соромна становіцца і за сябе, і за іншых. Як часта нам часоьці не хапае, чымсьці мы пакрыўджаны, на нешта скардзімся... А вось чалавек жыве сабе, працуе і вельмі шчаслівы. Пра працалюбных Занкевічаў нават тэлеперадачу знялі. Хоць формула іх поспеху вельмі простая — не лянуйся, але ж купляюць, каб вырасціць кароўку.

Людміла КРЫЧКО, старшыня Бабруйскага раённага Савета дэпутатаў:

— Уласныя падсобныя гаспадаркі — гэта перш за ўсё самазанятасць насельніцтва. Малако дае пэўны заробак, і людзі атрымліваюць свае грошы без затрымак. Гэта асабліва важна для жыхароў аддаленых вёсак, дзе з работай складанасці. Мы за тое, каб насельніцтва займалася такой работай. Гэта дае людзям магчымасць не толькі папраўляць сваё матэрыяльнае становішча, але і выхоўваць цікавасць да працы на зямлі ў сваіх нашчадкаў. Магчыма, нехта з іх пажадае прысвяціць сябе менавіта такой дзейнасці.

Што датычыцца работы зборшчыкаў і разлікаў з насельніцтвам, то тут наогул ніякіх праблем. Усяго на тэрыторыі раёна збор малака ў насельніцтва ажыццяўляюць тры прадпрымальнікі і два сельсаветы. І кожны робіць гэта вельмі сумленна і адказна. А выпадкаў, калі вяртаюць малако здатчыку, практычна не бывае. Людзі самі разумеюць, што трэба ўважліва адносіцца да патрабаванняў па якасці. Я другі год узначальваю райсавет, і яшчэ ніводнай скаргі па малаку не паступала. Акрамя, канешне, пажаданняў падняць закупачныя цэны на яго.

Запрашальнік

На ўрокі — у музей

Напярэдадні Дня ведаў Нацыянальны мастацкі музей запрашае дзяцей і бацькоў на свае, адмысловыя пазашкольныя заняткі. 31 жніўня з 12 гадзін да 17 гадзін тут пройдзе адкрыты ўрок для ўсіх аматараў мастацтва, незалежна ад узросту.

Незвычайныя музейныя персанажы Мальберцік і Палітрачка правядуць для дзяцей урачыстую лінейку. А яшчэ запросяць правесці разам адзін вучэбны дзень. У «раскладзе заняткаў» — не толькі культурна-адукацыйныя праграма (нясумныя ўрокі матэматыкі, літаратуры, гісторыі, чыстапісання, геаграфіі, хіміі, астраноміі, музыкі, працы і, канешне, выяўленчага мастацтва), але і вялікі перапынак з кінапраглядам, настольныя гульні, квэсты для дзяцей і дарослых. «Для кожнага з нашых вучняў падрыхтаваныя падарункі і сюрпрызы, таму, калі вы сумняваецеся, як правесці апошні дзень лета, зазірніце ў музей!» — запрашае куратар праекта, навуковы супрацоўнік аддзела навукова-асветніцкай работы Нацыянальнага мастацкага музея Алёна Машчонак.

Кошт квіткоў на «Адкрыты ўрок» для дзяцей ад трох гадоў — пяць рублёў, для дарослых — восем рублёў.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

Чытай болей

Кніга як нагода для сустрэчы

23 жніўня а 17-й гадзіне ў сталічным «Доме кнігі» — абноўленай кнігарні «Светач» — адбудзецца творчая сустрэча з папулярным пісьменнікам, паэтам і тэлевядучым Навумам Гальпяровічам.

На вечарыне, якая носіць назву «Сюжэт для Вечнасці» — уваход на яе, дарэчы, вольны — чытачы паслухаюць вершы ў аўтарскім выкананні, а таксама апавяданні з кніг «На скрыжаванні сноў» і «Час лістападу» — іх прачытаюць рэжысёр і акцёр, кіраўнік тэатра Беларускага радыё Алег Вінярскі і актрыса Марыя Захарыя. А ўлічваючы, што сярод запрошаных гасцей не толькі выдаўцы, прадстаўнікі Саюза пісьменнікаў Беларусі, вядомыя дзеячы медыясферы і культуры, але і барды і выканаўцы песень на вершы Навума Гальпяровіча, — мабыць, не абыдзецца і без музыкі... У якасці бонуса ўдзельнікі імпрэзы прадставяць новыя літаратурныя праекты, што ўжо гэтай восенню выйдуць на канале «Культура» Беларускага радыё. Напрыканцы сустрэчы адбудзецца аўтограф-сесія аўтара.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 75

Сённяшнюю задачу склаў мінчанін Віктар Равіна ***(гл. дыяграму)***.

Белыя: Крb8, Фс3, Ла5, Лh5, Сb6, Cd1, пп. f3, f5, g6 (9).

Чорныя: Крf4, Лb2, Сc1, Сc2, Kb5, пп. e6, g2, g3, h6 (9).

Мат за 2 хады.

Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru.

* * *

У сталіцы Славакіі Браціславе прайшлі юнацкія і дзявочыя чэмпіянаты Еўропы ва ўзроставых катэгорыях да 8, 10, 12, 14, 16 і 18 гадоў. Агульная колькасць удзельнікаў склала 1306 чалавек, якія прадстаўлялі 48 краін. Сярод іх — 4 гросмайстры сярод мужчын і 1 сярод жанчын, адпаведна 17 і 3 міжнародныя майстры, 81 і 41 майстар ФІДЭ. Узнагароды заваявалі прадстаўнікі 14 краін, на рахунку Расіі 12 медалёў, Азербайджана — 5, Украіны — 4.

Беларусь прадстаўлялі 30 юных шахматыстаў. На жаль, заваяваны толькі 1 медаль — «серабро» Вольгі Бадэлькі. Магіляўчанка, якая нядаўна атрымала званне міжнароднага гросмайстра, лідзіравала сярод дзяўчат да 18 гадоў да апошняга тура, ды ў ім усё ж страціла шанцы на «золата». На рахунку Вольгі шэсць перамог і тры нічыі.

Па словах Шабановіча, даводзіцца здаваць прадукцыю перакупшчыкам па 50, а то і па 30 капеек за кілаграм, што нават ніжэй за сабекошт. Праўда, іўеўскія агароднікі спадзяюцца, што попыт вырасце, калі зменшацца аб'ёмы ў іх канкурэнтаў з Пінска, якія рана прыходзяць на рынак. А памідораў і сапраўды многа. Толькі Шабановіч вырошчвае некалькі тон. Раней у раёне быў свой кансервавы завод па перапрацоўцы гародніны, але цяпер ён не працуе. Можа, варта яго ўзнавіць?

СЫРАВІНЫ ХОЦЬ АДБАЎЛЯЙ

Самыя значныя аб'ёмы — у Гродзенскай гароднінай фабрыкі. Па словах галоўнага агранома Мікалая Грэбня, пад памідорамі занята амаль 10 гектараў цяплічнай плошчы. Прычым, сёлета яе павялічылі ўтрая за кошт агуркоў. Аказваецца, памідоры лепш рэалізуюцца. Тым больш што цяпліцы забяспечваюць амаль круглагадовы ўраджай, з квадратнага метра плошчы здымаюць 45 кілаграмаў таматаў. Фабрыка — гарант стабільнай адпраўкі гародніны на беларускі рынак. Значную частку прадукцыі закупляе спажыўсаюз. Апошнім часам больш актыўна працуюць раённыя арганізацыі, якія рэалізуюць тавар праз гандлёвую сетку і пункты грамадскага харчавання. Такім чынам гродзенскі памідор даходзіць ва ўсе куткі рэгіёна. Закупачная цана — 50 капеек. У аддзеле нарыхтовак Гродзенскага спажыўсаюза адзначылі, што закупка вядзецца не толькі ў сваім рэгіёне, але і па ўсёй краіне, у тым ліку ў насельніцтва. І гэты сегмент таксама актыўна ўдзельнічае ў здачы сваёй прадукцыі. Што датычыцца аб'ёмаў, дык яны, як паведамілі ў аддзеле, застаюцца на ўзроўні мінулага года.

Танна можна купіць памідоры ў СВК «Свіслач». Тут прадукцыю рэалізуюць па 60—70 капеек за кілаграм. Такія прапановы можна ўбачыць на калгасным сайце. Але ў цэлым збыт прадукцыі праблематычны.

> — Ніхто не бярэ, вырошчваем, вытрымліваем усе патрэбныя стандарты, а на продажы пачынаецца збой. Варта неяк рэгуляваць гэты рынак і аддаваць перавагу свайму айчыннаму прадукту, а не прывазному, — зазначае галоўны аграном Сяргей Саўчык.

Гаспадарка, дарэчы, спецыялізуецца на вырошчванні гародніны. Пад памідоры адведзены цэлы гектар плошчы, але пасевы гэтай культуры будуць скарачаць дзеля праблем са збытам. Праўда, нейкую частку забярэ перапрацоўка, а куды падзець асноўны ўраджай, калі рынак перапоўнены? — задаецца пытаннем спецыяліст гаспадаркі. Акрэсліў ён і праблему дагаворных паставак гандлёвым арганізацыям. Па яго словах, яны могуць узяць менш, чым планавалася. А ўраджай закладваўся з улікам паставак, у выніку застаюцца значныя рэшткі.

Дарэчы, праблема са збытам характэрна і для іншых рэгіёнаў краіны. У сувязі з гэтым агароднікі імкнуцца прыцягнуць увагу дзяржавы да гэтага прадукту. У СМІ выказваліся нават прапановы зрабіць так, як у Лунінцы з клубніцамі, — выкінуць ураджай. Пакуль справа да гэтага не дайшла, але рэгуляваць працэс неабходна, лічаць вытворцы.

ШТО З ПЕРАПРАЦОЎКАЙ?

Зразумела, што рэалізаваць увесь ураджай таматаў складана. Плошчы пад культуру растуць, і спадзяванні на экспарт паціху зніжаюцца. Пра гэта сведчаць і гродзенскія вытворцы. А гандлёвыя прадпрыемствы часцяком робяць вялікія накруткі на тавар, і ён прадаецца марудна. Да таго ж многія аддаюць перавагу прывазным памідорам, якія доўга захоўваюцца. У той жа час беларускі тавар незапатрабаваны, хоць і больш экалагічны. Такія заўвагі, зноў жа, прагучалі з вуснаў гродзенскіх вытворцаў.

Напружаную сітуацыю магла б палепшыць перапрацоўка. І такое прадпрыемства у рэгіёне ёсць — даволі буйны кансервавы завод пад Гроднам з 60-гадовай гісторыяй. Дзесяць гадоў таму тут адбылася татальная рэканструкцыя, устаноўлены сучасныя лініі. Ёсць у асартыменце і нямала відаў прадукцыі з перапрацаваных таматаў — гэта і соўс, і паста, і таматы ў таматнай заліўцы, і марынаваныя. Дык можа прадпрыемства вырашыць наспелую памідорную праблему?

Аказваецца, што і тут памідор не вельмі запатрабаваны. У аддзеле вытворчасці паведамілі, што значная колькасць нарыхтовак яшчэ не прададзена з мінулага года, калі былі перапрацаваны даволі вялікія аб'ёмы. Таму на прадпрыемстве адмаўляюцца працаваць з сёлетнім ураджаем, хоць прапаноў хапае. Невялікую партыю — каля 3 тон — збіраюцца закупіць толькі ў СВК «Свіслач». Разам з тым на заводзе адзначылі, што сутыкаюцца з вялікай канкурэнцыяй гатовай прадукцыі на беларускім рынку.

Між тым славуты памідор, які стаў брэндам таго ж Іўя, і не толькі яго, у значнай ступені забяспечвае і самазанятасць мясцовых жыхароў. Як бачым, карысны прадукт знімае праблемы з працаўладкаваннем там, дзе няма прамысловых прадпрыемстваў. А значыць, спрыяе і дабрабыту насельніцтва. А да чаго, у рэшце рэшт, імкнецца дзяржава, як не да гэтага?

Маргарыта УШКЕВІЧ.

ШТО Ў ЗАСЕКАХ?

ЯБЛЫКАЎ МАЛА, але кавуны радуюць

Ужо некалькі гадоў, як фермеры і прыватныя гаспадаркі Беларусі ў цэлым і Гомельшчыны ў прыватнасці актыўна пачалі вырошчваць кавуны. Сёлета іх столькі, што абласное спажывецкае таварыства адмовілася ад закупак вялізнай салодкай ягады за межамі краіны і аддае перавагу мясцовым сартам. Начальнік упраўлення нарыхтовак, прамысловасці і знешнеэканамічнай дзейнасці Гомельскага абласнога спажывецкага таварыства Святлана АТРОШЧАНКА кажа, што арганізацыя закупляе больш за 100 відаў рознай прадукцыі і сыравіны.

— У нас сезон нарыхтоўкі пачаўся з ранніх агуркоў. Мы іх закупілі 607 тон, у тым ліку ў насельніцтва 430 тон. Агуркі яшчэ не скончыліся, сезон будзе працягвацца практычна да кастрычніка. Сёлета мы закупілі і 350 тон таматаў, з іх у насельніцтва — 280 тон. Гэтую гародніну закупляем пад поўную патрэбу.

Між тым клубніцам сёлета спрыяла надвор'е, і гэтай ягады нарыхтавана было 264 тоны — на чвэрць больш, чым летась. Чарніцы таксама не падвялі, і нарыхтоўшчыкі працавалі па-максімуме, адзначае Святлана Атрошчанка.

— Чарніц мы закупілі 254 тоны. Таксама тэмп росту вялікі — ён склаў 132 працэнты. З іх больш за 200 тон у замарожаным выглядзе мы экспартавалі ў краіны Прыбалтыкі і Польшчы. Паралельна закуплялі парэчкі чырвоныя і чорныя — адпаведна 36 тон і 45 тон. Сёлета актыўна займаемся зелянінай. Пятрушкі, сельдэрэю, кропу, зялёнай цыбулі, салаты закупілі аж 22 тоны. Па гэтых культурах мы выходзім на першае месца ў краіне.

З пачаткам дажджоў у лясах з'явіліся і грыбы. Але ж, як вядома, больш паловы тэрыторыі Гомельскай вобласці забруджана радыяцыяй. Менавіта таму гэтыя дарункі лясоў павінны праходзіць жорсткі кантроль, перш чым зборшчыкі атрымаюць за іх грошы. Нягледзячы на тое, што шмат грыбоў адвяргаецца, «чыстых» сёлета ўжо закуплена 4 тоны.

А вось з яблыкамі на Гомельшчыне праблема. Дрэвы так шчодра аддалі ўсё летась, што цяпер адпачываюць. Дарэчы, адсутнасці самых папулярных пладоў спрыяла і засуха, якая стаяла на поўдні краіны практычна ўвесь май і чэрвень. Цяпер спажывецкае таварыства актыўна закупляе папулярную садавіну ў іншых абласцях краіны. Рэсурснымі па яблыках сёлета сталі Брэсцкая, Гродзенская і Мінская вобласці. Між тым менавіта яблыкі з'яўляюцца асноўнай сыравінай для вінаробства і вытворчасці павідла.

Дарэчы, цана на яблыкі вырасла ў два-тры разы ў параўнанні з мінулым годам. Летась давалі толькі 5—8 капеек за кілаграм, а сёлета ўжо 18. Заканамерны працэс, да якога здатчыкі прызвычаіліся: калі сыравіны не хапае, адразу ж павышаецца цана. І наадварот.

Між тым на Гомельшчыне 136 прыёмна-нарыхтоўчых пунктаў актыўна працягваюць працаваць увесь сезон. Так што, калі бульбы, буракоў, фасолі і іншага будзе на падворку з лішкамі, можна прадаць гэты лішак нарыхтоўшчыкам. А адрасы заўсёды падкажуць у сельвыканкамах.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

РЭАЛЬНЫЯ КРОКІ ДАЮЦЦА НЕ ПРОСТА...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Вось, напрыклад, ідзе размова пра малыя гарады як месцы, найбольш прыдатныя для «зялёнай» эканомікі. Нагадаю, што да гэтай катэгорыі пасяленняў звычайна адносяцца тыя, дзе пражывае да 50 тысяч чалавек. Урбаністы адносяць да ліку такіх населеных пунктаў пасяленні з колькасцю жыхароў да 20 тысяч чалавек. Будзем выходзіць з першай лічбы.

Беларусь, як вядома, краіна малых гарадоў. З больш чым 200 гарадскіх пасяленняў (у Беларусі гэта гарады, гарадскія, рабочыя і адзін курортны пасёлак) амаль 90 % складаюць малыя, а пражывае ў іх усяго каля 20 % гарадскога насельніцтва. Тым не менш менавіта яны застаюцца крыніцамі самабытнасці беларускага народа, яго нацыянальнай культуры, традыцый і захаванага прыроднага асяроддзя.

> Неаднойчы звярталіся да мясцовых улад на прамую лінію з просьбай пачысціць раку хоць у межах пасёлка. У адказ чулі абяцанні, спасылкі на неабходнасць распрацоўкі праекта і ўключэння яго ў план будучых работ.

Праблема большасці малых гарадоў і асабліва гарадскіх пасёлкаў — наяўнасць, як правіла, аднаго горадаўтваральнага прадпрыемства, ад фінансавага стану якога ў значнай ступені залежыць іх развіццё. Ды і гэтыя прадпрыемствы ў апошнія гады, бывае, прыпыняюць сваю дзейнасць (спадчына СССР), а прыватны бізнес не набыў патрэбных маштабаў. Распрацаваныя ў рамках супрацоўніцтва з праектам ПраААН «Устойлівае развіццё на мясцовым узроўні» стратэгіі у такіх гарадах, як Тураў і Фаніпаль, сітуацыю ў цэлым не ратуюць. Адсюль — праблема адносна высокага ўзроўню беспрацоўя і як вынік — не надта высокага ўзроўню жыцця.

Яшчэ больш ускладняюць перспектывы далейшага развіцця малых гарадоў сучасныя дэмаграфічныя працэсы: вельмі нізкі натуральны прырост (у больш чым палове з іх ён увогуле адсутнічае), старэнне насельніцтва (ва ўзросце, старэйшым за працаздольны, знаходзіцца, як правіла, не менш чвэрці жыхароў), міграцыйны адток у вялікія гарады і іншыя.

Як бачым, у значнай колькасці малых гарадоў магчымасці развіцця прыватнага сектара вельмі абмежаваныя. Больш за тое, нават пры сур'ёзнай дзяржаўнай падтрымцы патэнцыял шматлікіх малых гарадоў не дазваляе ў сучасных умовах разгарнуць канкурэнтаздольную вытворчасць, не кажучы ўжо пра яе «зялёнае» аблічча.

Нельга не ўлічваць і тое, што малыя гарады вельмі розныя і патрабуюць у сваім развіцці дыферэнцыраванага падыходу. Аднак цяжка зразумець такую дыферэнцыяцыю, калі, напрыклад, той самы Навагрудак стаў пілотным горадам праекта «Зялёныя гарады», але ж у спіс пілотных раёнаў, на тэрыторыі якіх рэалізуецца праект «Падтрымка эканамічнага развіцця на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь», не ўвайшоў. Разам з тым у Мінскай вобласці да такіх пілотных раёнаў аднесены блізкія па сваім патэнцыяле Маладзечанскі і Барысаўскі раёны.

Найважнейшае эканамічнае патрабаванне пры размяшчэнні вытворчасці — агламерацыйны эфект, бо кампактна размешчаныя аб'екты, калі яны спалучаюцца, заўсёды больш эфектыўныя, чым размешчаныя ізалявана. На жаль, такім эфектам валодаюць толькі сталіца і некалькі буйных гарадоў краіны.

Увогуле, трэба вельмі адказна падыходзіць да ўкладання інвестыцый, асабліва да выбару месцаў для размяшчэння тых ці іншых аб'ектаў. Падзеі, звязаныя з будаўніцтвам акумулятарнага завода пад Брэстам, вытворчасцю цэлюлозы ў Светлагорску і іншыя толькі пацвярджаюць гэты тэзіс. І хоць названыя гарады не адносяцца да малых, перакананы: праблема размяшчэння прадпрыемстваў, нават і менш экалагічна небяспечных, актуальная і ў іх межах. Мяркую, што ва ўмовах, калі вывучэнне эканамічнай геаграфіі Беларусі будзе завяршацца ў дзявятым класе агульнаадукацыйных школ (так прадугледжана новым планам), памылак пазбегнуць не атрымаецца.

А вось яшчэ адзін прыклад з маіх родных Смілавіч. Рэальная колькасць усіх занятых у прыватным бізнесе сёння ў гэтым пасёлку ў разы саступае колькасці некалі занятых на адным гарбарным заводзе, якога ўжо няма. Заўважце, размова ідзе пра аб'ект, які амаль поўнасцю абапіраўся на ўласную сыравіну і ў 70-я гады XX ст. правёў рэканструкцыю. Па сутнасці, тады было створана новае прадпрыемства. Але ўжо каля дзесяці гадоў на яго месцы стаіць адзін каркас, і толькі сёлета пачалося «лёгкае варушэнне». Трэба было ўсё разбурыць, каб потым стварыць сумесны турэцка-беларускі бізнес па вытворчасці медыцынскіх прэпаратаў, які ў найлепшым выпадку дадаў некаторую колькасць рабочых месцаў.

Адмыслова не закранаю экалагічны аспект былога і ствараемага на яго месцы прадпрыемстваў у Смілавічах. Заўважу толькі, што гэта цэнтр пасёлка, а да ракі Волмы 50 метраў — да яе і пракладзена ліўневая каналізацыя. Пагадзіцеся, што тут цяжка будзе ўбачыць нешта ад «зялёнай» эканомікі.

А вось сама рака даўно чакае аздараўлення. Апошні раз яе чысцілі ў 50-я гады XX ст. Непасрэдна я сам і яшчэ некалькі нераўнадушных грамадзян неаднойчы звярталіся да мясцовых улад на прамую лінію з просьбай пачысціць раку хоць у межах пасёлка. У адказ чулі абяцанні, спасылкі на неабходнасць распрацоўкі праекта і ўключэння яго ў план будучых работ. Мы можам пачакаць, але рака чакаць не можа, яна ўсё больш зарастае і гіне.

Літаральна на працягу мая — ліпеня ў Смілавічах распачата актыўнае добраўпарадкаванне цэнтральнай часткі ў выглядзе замены асфальту на брусчатку. Аднак у працэсе добраўпарадкавання было вырублена некалькі дрэў. А дзе ж у такім выпадку новыя пасадкі? Больш таго, каля крамы «Сямёрачка» пашырылі пляцоўку для паркоўкі машын, у сувязі з чым давялося таксама спілаваць некалькі дрэў... Вось такія «зялёныя» прыярытэты на лакальным узроўні.

> Розныя дзяржаўныя і рэгіянальная праграмы, уся адукацыйная сфера ў той ці іншай ступені ўтрымліваюць экалагічны складнік. Аднак патрабаваннем дня з'яўляюцца не тэарэтычныя палажэнні, а рэальныя крокі на гэтым шляху.

Мяркую, органам тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання тут ёсць над чым падумаць і куды прыкласці намаганні. Глыбока перакананы ў тым, што сродкі, якія пайшлі на брусчатку ў вышэйзгаданым выпадку, былі б з большай карысцю выдаткаваны на вырашэнне іншых жыццёва важных праблем.

Спадзяюся, што ўзнятая тэма зацікавіць чытачоў газеты з малых гарадоў Беларусі і яны змогуць параўнаць напісанае з тым, што робіцца па прасоўванні «зялёнай» эканомікі на іх радзіме, і падзеляцца сваімі разважаннямі з газетай.

Вячаслаў САСНОЎСКІ,
кандыдат геаграфічных навук, дацэнт.

И З В Е Щ Е Н И Е о проведении повторного открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «Торговое автопредприятие» 4 сентября 2019 года

№ лота	Предмет аукциона (наименование объекта, его местонахождение, площадь)	Начальная цена продажи предмета аукциона, бел. руб., к. (с учетом НДС)	Размер задатка, бел. руб., к.	Характеристика объекта	Условие аукциона
1	Благоустройство территории с инвентарным номером 700/С-106076, общей площадью 3 495,5 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ш. Славгородское, территория ш. Славгородское, 159	40 320 р. 00 к.	4 032 р. 00 к.	Благоустройство территории состоит из: асфальтобетонное покрытие площадью 2 678,3 кв. м, бордюр бетонный длиной 29,65 м; бетонное покрытие площадью 817,2 кв. м, бордюр бетонный длиной 153,25 м; ограждение металлическое длиной 22,5 м; ворота металлические.	Без условий

Начальная цена снижена на 50 %.
Аукцион состоится 4 сентября 2019 года в 15.00 в здании Могилевского городского исполнительного комитета по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а.
Заявки принимаются ежедневно с 23 августа 2019 г. в рабочие дни с 8 до 17 часов (обеденный перерыв с 13.00 до 14.00) по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 407.
Последний день приема заявлений и внесения задатка – 3 сентября 2019 года до 17.00. Заявления, поступившие после указанного срока, не рассматриваются.
Заключительная регистрация участников аукциона 4 сентября 2019 года с 14.00 до 15.00.

Продавец: ОАО «Торговое автопредприятие», 212030, г. Могилев, Славгородское шоссе, 159, контактные телефоны – (80222) 46-70-82, 8-044-727-30-44 (вел.).
Организатор аукциона – МГ УКП «Центр по приватизации», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, контактные телефоны – (80222) 42-25-64, 42-24-59, 8-029-15-15-444.
Аукцион проводится в соответствии с порядком проведения открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «Торговое автопредприятие».
Недвижимое имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 740100000007005014, площадью 1,0236 га, назначение – земельный участок для обслуживания зданий и сооружений.
Лица, желающие принять участие в аукционе, не позднее срока, указанного в извещении о проведении аукциона, подают заявление на участие в аукционе, подписанное с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон, заявление об ознакомлении с объектом, к которым прилагаются:
- документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный банковский счет организатора аукциона - МГ УКП «Центр по приватизации» BY66BLBB30120700008710001001 Дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Могилевской области, код BLBBBY2X, УНН 700008710 с отметкой банка;
- юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;
- иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;
- иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;
- представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленным законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);
- представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;
- представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).
Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан в установленном порядке возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение.
Договор купли-продажи заключается продавцом и победителем аукциона (единственным участником аукциона) в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола о результатах аукциона.
Условия и порядок оплаты – оплата стоимости приобретенного на аукционе предмета аукциона производится в течение 10 банковских дней с момента заключения договора купли-продажи.
С объектом можно ознакомиться ежедневно в рабочие дни недели с 8 до 17 часов, предварительно согласовав время с продавцом.
В предусмотренных законодательством случаях уплачивается штраф организатору аукциона в течение одного месяца в размере 100 базовых величин: **победителем аукциона** – в случае, если он в установленный срок не подписал протокол о результатах аукциона, не возместил организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение аукциона, не подписал договор купли-продажи предмета аукциона; **лицом, приравненным к победителю аукциона,** – в случае его отказа (уклонения) от возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и (или) подписания договора купли-продажи предмета аукциона; **участниками аукциона** – в случае их отказа объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным.
Полная информация о выставленном на аукцион объекте недвижимости опубликована в газете «Звязда» № 120 (28987) – 28 июня 2019 г.
Контактные телефоны организатора аукциона для уточнения и получения дополнительной информации: (80222) 42-25-64, 42-24-59, 8-029-15-15-444

Информационное сообщение

о проведении аукциона по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в дер. Глинище и дер. Жажелка Жодинского сельсовета Смолевичского района Минской области

1	Форма проведения аукциона	Открытый
2	Дата, время и место проведения аукциона	**24 сентября 2019 года, в 10.00** г. Жодино, пер. Молодежный, 3 Жодинский сельисполком, кабинет № 1
3	Продавец и его адрес	Жодинский сельский исполнительный комитет, г. Жодино, пер. Молодежный, 3
4	Земельный участок, его кадастровый номер и адрес	**Лот № 1** – земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881704101000057 в дер. Глинище **Лот № 2** – земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624888170410100058 в дер. Глинище **Лот № 3** – земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881705601000157 в дер. Жажелка
5	Условия продажи	Без изменения целевого назначения
6	Целевое назначение земельного участка	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома
7	Начальная цена продажи	**Лот № 1** – 5 000,00 рублей **Лот № 2** – 5 000,00 рублей **Лот № 3** - 5000,00 рублей
8	Условия проведения аукциона	А) продажа по цене, не ниже начальной Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь В) наличие не менее двух участников Г) без права предоставления рассрочки
9	Наличие инженерной инфраструктуры	**Лот № 1 (в населенном пункте имеется газоснабжение) Лот № 2 (в населенном пункте имеется газоснабжение)**
10.	Сумма задатка и реквизиты продавца	10 % от начальной цены земельного участка, р/с BY49AKBB36410616005746200000 в ЦБУ № 616 в филиале 612 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Жодино, ул. 50 лет Октября, 25«А», БИК AKBBBY21612, УНП 600023532 (с пометкой «Задаток за земельный аукцион»)
11	Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками	Каждую среду в 15.00
12	Начало подачи заявлений	С 23 августа 2019 года с 8.00 до 17.00, каб. № 3
13	Окончательный срок приема заявлений	**20 сентября 2019 года до 17.00**
14	Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона	Внесение победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона в течение десяти рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся платы за земельный участок и возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и внесения платы за земельный участок; осуществление победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона государственной регистрации создания земельного участка и прав на него в Смолевичском бюро Борисовского филиала РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в течение двух месяцев со дня принятия решения о предоставлении земельного участка; получение победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома; занятие (освоение) земельного участка не позднее одного года со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и права на него
15	Контактный телефон	8-01775 35-449, 8-01775 37-174

Расходы по организации и проведению аукциона и затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона и составляют: Лот № 1 – 1 670,22 рубля; Лот № 2 – 1670,22 рубля; Лот № 3 – 1 602,12 рубля (затраты без учета стоимости информационного сообщения).

Затраты на строительство, в том числе на проектирование объектов распределительной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам, подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».

Примечания: для участия в аукционе на адрес продавца необходимо представить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Документ (копию), удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица.
4. Доверенность, заверенную нотариально (в случае, если на аукционе интересы покупателя представляет это лицо).

НАША БЯСПЕКА

У лес... па прыгоды?

Ратавальнікі займаюцца прафілактыкай. Але без «сезонных» здарэнняў не абыходзіцца

— Кожнае лета мы папярэджваем аматараў «ціхага палявання», каб абавязкова прытрымліваліся пэўных правілаў паводзін у лесе, але яны ігнаруюцца, — абураецца **старшы інспектар абласнога ўпраўлення МНС Вольга НЕХАРОШЫХ.** — Практычна праз дзень нехта ўсё роўна губляецца ў лесе. Толькі сёлета ў Магілёўскай вобласці ратавальнікі ўдзельнічалі ў пошуках 59 чалавек, у тым ліку пяці дзяцей. Ураджайным па ліку такіх здарэнняў было 17 жніўня. У лясных гушчарах каля аграгарадка Заводская Слабада Магілёўскага раёна заблудзіўся 54-гадовы магіляўчанін. Зразумеўшы, што сам ён з лесу не выйдзе, патэлефанаваў на нумар 101. Праз дзве гадзіны яго, нарэшце, атрымалася адшукаць. На шчасце, у медыцынскай дапамозе ён не меў патрэбы. У гэты ж дзень у другой палове дня паступілі SOS ад 61-гадовага жыхара Крычава, які заблукаў у лесе каля вёскі Каранец, і ад родных 77-гадовага пенсіянера з Бабруйскага раёна, які да дзевяці вечара не вярнуўся з лесу. У пошуках былі задзейнічаны супрацоўнікі МУС і МНС. Але пенсіянеры знайшлі дарогу з лесу самастойна.

Хутка пойдуць журавіны, і людзі зноў у масавым парадку накіруюцца ў лес. Вольга Нехарошых у чарговы раз папярэджвае: па магчымасці не адпраўляйцеся туды адны, надзявайце зручныя, непрамакальныя адзенне і абутак, абавязкова праверце, ці зараджана батарэя вашага мабільнага тэлефона, не забудзьце прыхапіць ваду, лекі, нож, ежу, запалкі і абавязкова папярэдзьце родных, па якім маршруце вы адпраўляецеся і калі збіраецеся вярнуцца. Калі з вамі ў лес ідзе яшчэ і непаўналетняе дзіця, трэба ўсю сваю ўвагу ўдзяляць непасрэдна яму.

Адметнасць гэтага лета — навальнічнае надвор'е. Калі аб'яўлена штармавое папярэджанне, ў лес лепей не сунуцца. Прычым не толькі ў лес, але і наогул далёка ад дома. Падчас навальніцы не трэба хавацца пад адзінокімі дрэвамі, знаходзіцца паблізу ад вышынных аб'ектаў, громаадводаў, антэн, вадасцёкаў, а тым больш — на беразе ракі або ў вадзе. Найбольш бяспечнае месца — сухая нізіна паміж пагоркаў. Прысядзьце на кукішкі і прыхіліце галаву да каленяў. І не забывайце, што падчас навальніцы нельга нават раскрываць парасон. Калі неба рассякаюць маланкі, не варта расслабляцца і дома. Хуценька выключайце ўсе электрапрыборы і зачыняйце вокны і дзверы. Ратавальнікі таксама раяць у такія хвіліны не дакранацца да мабільнага тэлефона і металічных дэталяў, не мыць посуд, не прымаць душ або ванну, не стаяць каля акна, печы, каміна, масіўных металічных прадметаў.

А вось прыклад, як той казаў, з іншай оперы. Лета ж — яшчэ і час рамонтаў. У Бабруйску адбыўся выпадак з гэтай нагоды.

— Каб асвяжыць інтэр'ер кватэры, жанчына паставіла на газ ёмістасць з вадой, у якую змясціла бляшанку з фарбай, — расказвае Вольга Нехарошых. — Ад высокай тэмпературы фарба загарэлася, і гаспадыня пачала заліваць яе вадой. Яна не ведала, што рабіць гэта катэгарычна забаронена. У выніку агонь цалкам ахапіў кухню, але жанчына, на шчасце, паспела эвакуіравацца на балкон, адкуль яе ўжо здымалі супрацоўнікі МНС. Лёгкаўзгаральныя вадкасці наогул нельга награваць і тушыць вадой! Для іх тушэння выкарыстоўваюцца вуглекіслотныя і парашковыя вогнетушыцелі. А ў дамашніх умовах з узгараннем такіх вадкасцяў дапамогуць справіцца коўдра, палітo, лазневы ручнік і іншыя падобныя — не сінтэтычныя — рэчы.

Больш даведацца пра надзвычайныя сітуацыі, спосабы іх прадухілення і барацьбы з імі можна на сайце МНС Рэспублікі Беларусь «112.бай», а таксама спампаваўшы мабільную праграму «МНС Беларусі: дапамога побач».

Нэлі ЗІГУЛЯ.

У тэму

За 7 месяцаў гэтага года ў Магілёўскай вобласці адбылося 487 пажараў, загінула 42 чалавекі, яшчэ 44 (у тым ліку чатыры дзіцяці) траўмаванымі. У выніку пажараў знішчана 146 пабудоў і 16 адзінак тэхнікі, загінула 37 жывёл.

ПЫТАННЕ — АДКАЗ

ВЫКЛЮЧЭННІ З ПРАВІЛАЎ

«Патлумачце, калі ласка, у якіх выпадках наймальнік можа істотна змяніць умовы працы работніка? А калі гэта малады спецыяліст?»

І. Абрамчык, Барысаўскі раён.

Наймальнік мае права істотна змяніць умовы працы работніка толькі ў выпадку, калі ёсць абгрунтаваныя вытворчыя, арганізацыйныя або эканамічныя прычыны. Да такіх адносяцца, у прыватнасці, рацыяналізацыя рабочых месцаў, змена тэхнікі і тэхналогій вытворчасці, увядзенне новых формаў арганізацыі працы, удасканаленне рабочых месцаў на аснове атэстацыі, рэарганізацыі, перапрафілявання вытворчасці і іншыя. Але правілы аб змяненні ўмоў працы прымяняюцца толькі ў тых выпадках, калі чалавек працягвае работу па той жа спецыяльнасці, кваліфікацыі або на пасадзе, вызначанай у працоўным дагаворы, кантракце. Наймальнік абавязаны папярэдзіць работніка аб змяненні істотных умоў працы пісьмова не пазней чым за месяц або адпаведна з падпунктам 3.2 пункта 3 Дэкрэта № 5 не пазней чым за 7 каляндарных дзён. Калі работнік адмаўляецца ад прапановы, то працоўны дагавор (кантракт) з ім спыняюць з выплатай выхадной дапамогі ў памеры не менш за двухтыднёвы сярэдні заробак (калі іншага не ўстаноўлена калектыўным дагаворам, пагадненнем).

Звальненне маладых спецыялістаў, рабочых, служачых або перавод іх на іншую работу, не звязаную з атрыманай спецыяльнасцю і прысвоенай кваліфікацыяй, да заканчэння тэрміну абавязковай адпрацоўкі забараняецца! Выключэнне — пераход на выбарную пасаду, перазмеркаванне па рашэнні ўстановы адукацыі або выдача даведкі аб самастойным працаўладкаванні, залічэнне на вучобу ва ўстанову адукацыі больш высокага ўзроўню.

А Ў НАС... А Ў ВАС?

ПРЫГОЖА, ВЕСЕЛА І СМАЧНА!

У Карэліцкім раёне зладзілі свята кветак Colours і яблычны фэст

Найсмачнейшая шарлотка, найлепшы яблыневы сад, найпрыгажэйшы веласіпед, убраны кветкамі, і самы незвычайны букет... Гэтымі і іншымі задумамі ды вырабамі з фруктаў і кветак здзіўлялі ўдзельнікі фестывалю кветак у аграгарадку Аюцавічы і яблычнага фэсту ў вёсцы Кожава. Сіламі і імпэтам мясцовых жыхароў, заўзятых аматараў павесяліцца і падарыць радасць сабе і суседзям, такія святы каторы год адзначаюць у вёсачках раёна. Без удзелу людзей, якія старанна рыхтуюцца да фэсту: гатуюць, майструюць, прыдумляюць, натхняюць іншых, не было б той чароўнай шчырай атмасферы, у якой кожны адчувае сябе сваім, тутэйшым.

Казка з красак

Папяровыя цюльпаны, саламяныя рамонкі, шаўковыя сланечнікі, макі з пафарбаванага клею... Гэткае харство ў выглядзе карцін, тапіярыяў, кашолачак, шкатулак, упрыгожаных штучнымі і сапраўднымі кветкамі, сустракала гасцей свята Colours. Кветкі былі паўсюль: на сталах, у вазах, чыгунках, на капелюшах, сумачках, і нават у чамадане ды на веласіпедах.

Госці свята пабачылі дэфіле ўдзельніц конкурсу «Найлепшы жаночы аксесуар з кветак», танцавальны флэшмоб мясцовых вучняў і безліч цікавых вырабаў.

Тут вам і трох'ярусны торт з жывых кветак, і ўпрыгожанні для валасоў, і «Любы сэрцу Карэліцкі край» — работа ў чамадане, дзе побач з кветкамі ляжаць сонечныя акуляры, часопісы, капялюш ды парасон — хоць зараз выпраўляйся з такім багажом у падарожжа.

Свае работы на кветкавую тэматыку прывезлі на свята і навучэнцы **Мірскай дзіцячай школы мастацтваў, якой кіруе Вольга ВЕДЗЯНЕЕВА.**

— Вось гэта нашы дзеці рабілі ў падарунак матулям на 8 Сакавіка, а гэта вырабы з гліны: бранзалеткі з гліняных шарыкаў-кветачак і фігуркі вясёлых коцікаў ды смаужоў, — паказвае яна работы сваіх вучняў.

Я не вытрымала — набыла ката ў выглядзе падковы і павесіла яго як абярэг у машыну. Цяпер ездзіць весялей.

А вось цацачны веласіпед з ільняных нітак, на колах якога распусціліся звязаныя блакітныя кветачкі, а там шкатулкі, вечкі якіх аздоблены штучнымі кветкамі, і нават міні-бярозкі з бісеру — вырабы малых з аматарскага аб'яднання «Горад майстроў», якім кіруе **Наталля ГАРКАВАЯ, бібліятэкар аграгарадка Аюцавічы.**

— Мы працуем з любымі прыроднымі матэрыяламі: шышкамі, кветкамі, лістотай. Цяпер вось задзейнічаем ільняную нітку, а тых, хто сёлета адпачывае на моры, прашу прывезці ракавінкі, — расказвае кіраўніца гуртка. — Мы працуем з 2005 года, пачыналі з бісеру і вязання сурвэтак кручком. Аднак час ідзе, густы мяняюцца, таму мяняем свой падыход і мы. Маім першым вучаніцам ужо па 25—26 гадоў, але яны прыходзяць у бібліятэку пацікавіцца, што новага з'явілася.

Наталля Гаркавая, дарэчы, стала сярэбраным прызёрам конкурсу на найлепшую кампазіцыю з кветак, а першае месца атрымала Анжаліка ШАСТАК, бібліятэкар Карэліцкай раённай бібліятэкі, — за твор з чамаданам, прысвечаны 75-годдзю Гродзенскай вобласці, якое адзначаецца сёлета.

Выбраць веласіпед, лепш за іншыя ўпрыгожаны кветкамі, журы так і не змагло, таму адзначылі прызамі ўсіх удзельнікаў гэтага спаборніцтва.

Вёска Радзівіла і зоркі

Другое мерапрыемства, якое ў той дзень прайшло на Карэліччыне, адбылося ў вёсцы Кожава, што цяпер уваходзіць у Жухавіцкі сельсавет, а ў XVIII стагоддзі была сялом Мірскага графства і належала Радзівілам. Тут адзначалі адразу і Яблычны Спас, і свята вёскі.

Яблычны фестываль тут арганізавалі нездарма. У сельскагаспадарчым кааператыве «Жухавічы» — адзінай у раёне гаспадарцы, якая спецыялізуецца на вырошчванні яблыкаў, — квітнее 40 гектараў духмяных фруктаў.

— Свята вёскі штогод адзначаецца ў розных мястэчках раёна. Сёлета яго вырашылі правесці ў Кожаве і сумясціць з брэндавым мерапрыемствам — Яблычным Спасам, — кажа **старшыня Жухавіцкага сельскага Савета дэпутатаў Аляксандр ІВАШКА.** — Будзем віншаваць самых старэйшых і маладых вяскоўцаў, сужэнцаў, якія пражылі разам шмат гадоў. Усяго ў Кожаве 198 жыхароў, прыязджаюць сюды жыць нават армяне і грузіны, працуюць у мясцовым калгасе.

Самыя сталыя жыхары вёскі — Вера КАЛОДКА, якая нядаўна адзначыла 95-годдзе, і Дзям'ян СЯЛЯЎКА, якому ўвосень будзе 93. Для іх загарэлася зорка «Мудрасць».

Не абмінулі ўвагай і адзінага ветэрана вайны Вольгу ХІНЕВІЧ, у гонар якой запалілася зорка «Перамога».

Але якое свята без пачастунку?.. Стол з конкурснымі стравамі ледзьве не ўгінаўся ад прысмакаў, якія згатавалі мясцовыя гаспадыні. Тут і шарлотка, і піражкі з яблычным павідлам, і пірагі, і аладкі... А лялькі гаспадара ды гаспадыні «выглядалі» з-за плоту і запрашалі на выстаўку работ лялечнай майстэрні, якой кіруе Людміла Саўчанка-Кір'янава.

Мікалай КАДЛУБАЙ, супрацоўнік Карэліцкага краязнаўчага музея, які на свяце выконваў ролю беларускага гаспадара і збіваў масла ў самай што ні на ёсць сапраўднай маслабойцы, частаваў гасцей хлебам з маслам, якое збіў адмыслова да свята.

— Суседка прынесла хатняе малако, і ўчора я масла збіў. Каштуйце, не бойцеся! Гэта ўсё свежае, гаспадарскае, натуральнае.

Дарэчы, гаспадары ў Кожаве вельмі руплівыя. Вёска дагледжаная, чыстая, акуратная, як і сады. Найлепшым яблыневым садам прызналі ў той дзень дрэвы на падворку Міхаіла ШТЫЦЬКО і ў яго гонар запалілі зорку «Добраўпарадкаванасць».

У гонар супрацоўнікаў СВК запалілі зорку «Руплівасць», а сямейныя дынастыі адзначылі зоркай «Пашана». Самая маленькая зорка «Карапуз» запалілася для Віктара КВАПІСА і Станіслава ХІНЕВІЧА — хлопчыкаў, якія нарадзіліся ў 2016-м.

— Калі ў вёсцы ёсць жыхары, якія клапоцяцца пра яе, калі ў ёй чуваць дзіцячыя галасы, калі прыязджаюць родныя і блізкія, яна будзе жыць, — лічыць **начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Карэліцкага райвыканкама Іна САНЧУК.** Ёй, дарэчы, выпала цяжкая і салодкая справа: пакаштаваць стравы і вызначыць пераможцу конкурсу прысмакаў, якой стала Маргарыта ЗВОНКА. Яе шарлотка і выглядам, і формай, і пахам проста сама прасілася ў рот.

Бліжэй да вечара, удосталь натанцаваўшыся і начаставаўшыся, людзі перамясціліся бліжэй да возера — працягваць свята вёскі ды яблыкаў.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

Тым часам

Сырныя святы пройдуць на Гродзеншчыне 24 жніўня

Піцу-велікан спякуць у аграгарадку Жупраны Ашмянскага раёна падчас свята «Вясковы сыравар», а ў Навагрудку пройдзе квасны марафон на свяце «Хлеб, сыр, квас і добры настрой».

Найбольш актыўныя паўдзельнічаюць у «Сырных паядынках» у Жупранах, паспрабуюць сябе ў «Малочных прыгодах» або «падояць карову». А пакаштаваць і набыць хатнія малако, сыр, масла і разнастайныя творожныя стравы з каровінага ды казінага малака змогуць абсалютна ўсе. Галоўнай «сырнай разынкай» свята «Вясковы сыравар» стане піца-велікан, якой арганізатары абяцаюць пачаставаць кожнага госця, што прыедзе на свята.

Падчас свята «Хлеб, сыр, квас і добры настрой» у Навагрудку мясцовыя прадпрыемствы на імправізаваных падворках правядуць майстар-класы і цікавыя конкурсы. А пастаянныя ўдзельнікі свята — манахі Свята-Елісееўскага Лаўрышэўскага мужчынскага манастыра — прапануюць сваю выпечку, мёд і травяныя бальзамы.

Гасцей чакаюць забегі с перашкодамі, спаборніцтвы ў лепцы фігурак з цеста, стварэнне караляў з абаранак, віктарыны і навіны пра сыр. На «Рамесным праспекце» можна будзе пакаштаваць і набыць шмат смачнай і карыснай прадукцыі ў сырнай, хлебнай і квасной зонах.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч. Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.,** намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.,** намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.,** старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.,** старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.,** старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 287 18 31;

e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 22 жніўня 2019 года.